

ВЕТЭРАН З ПРАСПЕКТА ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

7

ШТО ПІСАЛІ ПРА «ЗВЯЗДУ» Ў ТВОРАХ?

12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЧЭРВЕНЯ 2023 г.
СУБОТА № 120 (30000)

## № 30000



Фота БелТА.

Падзяку ад Прэзідэнта атрымала выпускніца факультэта «Тэхнічны сервіс у АПК» БДАТУ Анастасія ХАРТАНОВІЧ.

# Маладым паўсюль у нас дарога

**Дзень 23 чэрвеня быў, без перабольшвання, днём выпускнікоў ВНУ. Спачатку ў Палацы Незалежнасці прайшла ўрачыстая цырымонія — Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў падзячныя лісты найлепшым выпускнікам і выкладчыкам. А ўвечары — таксама з удзелам кіраўніка дзяржавы — прайшоў Рэспубліканскі баль выпускнікоў ВНУ, на які былі запрошаны каля пяці тысяч учарашніх студэнтаў з усёй краіны. Упершыню мерапрыемства адбывалася на адкрытым паветры, на пляцоўцы каля Палаца спорту.**

**Сімвалічна, што свята праходзіла напярэдадні Дня моладзі і студэнцтва, якое будзе адзначацца заўтра. Як гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта, прымеркаваным да гэтага дня, «маладосць — дзівосны час, напоўнены жаданнем ствараць, здзяйсняць вялікія ўчынкі, увасабляць у жыццё самыя смелыя задумы і мары». У віншаванні кіраўнік краіны выказаў упэўненасць, што веды, набытыя ва ўніверсітэцкіх лабараторыях, ідэалы, засвоеныя ў гутарках з мудрымі настаўнікамі, дазволяць маладым людзям напісаць чарговую яркую старонку гісторыі краіны, насычаную важнымі падзеямі і дасягненнямі. «У Беларусі заўсёды будзе шчаслівы той, для каго адданасць Радзіме і служэнне агульнай справе — не пустыя словы, а ўнутраны жыццёвы арыенцір», — гаворыцца ў віншаванні.**

**Пра іх — шчаслівых маладых людзей, якія ступаюць у дарослае жыццё з ужо набытай прафесіяй, а таксама пра тое, які наказ даваў ім Прэзідэнт, — у рэпартажах нашых карэспандэнтаў.**

СТАР. 2

# НУМАР ТРЫЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ

*Да юбілейнага, 30-тысячнага, нумара газеты мы задумалі зрабіць фота з друкарні, з Беларускага Дома друку, куды кожны дзень адпраўляем звярстаныя палосы і адкуль ноччу ва ўсе куткі Беларусі развозіцца ўжо гатовая газета. Наш фатограф Анатоль Кляшчук справіўся з пастаўленай задачай. Вось так цяпер выглядае выхад газеты ў свет: не абыходзіцца без сучасных тэхналогій, без камп'ютара. Спецыялісты вышэйшага разраду Беларускага Дома друку, якія працавалі і над сённяшнім нумарам: Святаслаў ГРАБЛЮК, Алег ЛІСОЎСКІ і Віктар КОЛІК — шмат могуць пра гэта расказаць. Як і пра тое, як мяняліся, асучасніваліся апошнім часам друкарскія тэхналогіі: яны працуюць у паліграфіі амаль трыццаць гадоў, а ў газетным цэху Дома друку — дваццаць...*

*Першыя нумары нашай газеты больш за сто гадоў назад друкаваліся на прымітыўных па сённяшнім часе станках, гранкі са свінцовымі літарамі набіраліся ўручную. Падчас Вялікай Айчыннай вайны «Звязду» набіралі ў хатах падпольшчыкаў, у партызанскіх зямлянках, друкавалі кустарным спосабам, часам нават на шпалерах. Нумар у першую гадавіну вызвалення ад фашыстаў зрабілі святочна-каляровым, расфарбаваўшы за ноч уручную ўвесь шматтысячны тыраж... Пасля былі лінатыпы, якія ўвесь час удасканальваліся, нарэшце з'явіліся сучасныя друкарскія машыны, здольныя «адмахаць» тыраж за некалькі хвілін...*

*Але нязменным застаецца адно. Мы, як і папярэднія пакаленні «звяздоўцаў», стараемся рабіць газету менавіта для сваіх чытачоў. Трыццаць тысяч нумароў мы, «звяздоўцы», для вас і пра вас зрабілі. Дзякуючы вашай падтрымцы і вернасці, спадзяёмся, будзе яшчэ і сто, і тысяча, і пяць тысяч наступных.*




ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «НЕ ЎПУСЦІЦЕ СВАЮ ЗЯМЛЮ, ІНШАЙ Ў ВАС НЕ БУДЗЕ»

**Вечарам пяць тысяч выпускнікоў ВНУ сустрэліся з кіраўніком дзяржавы на рэспубліканскім свяце «На крылах мары». На мерапрыемства таксама былі запрошаны высокія госці — вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, рэктары ВНУ.**




Фота БелТА.

Вітаючы ўдзельнікаў свята, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў такім фармаце ў самым цэнтры сталіцы выпускны праводзіцца ўпершыню.

«Дазвольце павіншаваць вас з вялікім святам. З адзіным у жыцці святам, якое ніколі не паўторыцца», — сказаў Прэзідэнт. Ён прызнаўся, што, падыходзячы да месца правядзення свята, адчуў выключную атмасферу. «І гэту атмасферу робіце вы — сваёй маладосцю і прыгажосцю. А як інакш? Вашу эйфарыю лёгка зразумець. За плячыма напружаныя гады вучобы, залікаў, іспытаў, бяссонных начэй (маю на ўвазе ночы, праведзеныя з падручнікам). А заўтра — новае жыццё. Таму сёння весяліцеся. А заўтра да новых поспехаў. Вы будзеце выхоўваць, вучыць, лячыць, будаваць дамы, развіваць тэхналогіі, ствараць шэдэўры мастацтва і многае іншае. Будзеце ахоўваць мір, забяспечваць нацыянальную бяспеку», — сказаў кіраўнік дзяржавы.



Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што момант сур'ёзны яшчэ і тым, што з заўтрашняга дня ў руках маладых людзей, у кожнага маладога выпускніка, маладога чалавека будзе часцінка нашай Радзімы. «А разам мы будзем трымаць нашу краіну, нашу Радзіму ў нашых руках. І, як я раніцай сёння ўзнагароджаным ужо сказаў: глядзіце, гэта ўжо ваша адказнасць. Не ўпусціце сваю зямлю, іншай у вас не будзе. Дзе б вы ні былі, дзе б ні вучыліся далей, дзе б вы ні працавалі. Гэта ваша. І сваё нікому не аддавайце», — заклікаў маладых людзей Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што хутка выпускнікі на сваё першае працоўнае месца раз'едуцца па розных кутках Беларусі. «І чым меншы будзе гэты куток, тым больш прыкметнымі вы будзеце, тым большы будзе ваш уклад у гісторыю роднай краіны. Нашай утульнай, прыгожай, чыстай Беларусі, якую мы ўсе любім! Але думаць аб гэтым і ўсё планаваць будзеце заўтра. Якія надзеі мы — Прэзідэнт, вашы бацькі і педагогі — на вас ускладаем, я сказаў сёння раніцай, калі ўзнагароджваў самых лепшых з вас», — падкрэсліў беларускі лідар, дадаўшы, што яго словы датычацца і ўсіх дзясяткаў тысяч беларускіх выпускнікоў.

«Рабіце ўсё своечасова. Рабіце сёння тое, што павінны рабіць. Заўтра вы гэта не зробіце, таму што розныя праблемы, турботы. Вас захлісне жыццё. Бурнае, шалёнае, часам ашалелае жыццё. І мы гэта пражываем разам з вамі, часам не разумеючы, што адбываецца. Таму трэба рабіць усё своечасова. Запомніце, гэта галоўнае. Цяпер я проста шчыра радуюся таму, што ёсць магчымасць падарыць нашай моладзі гэтае свята ў Мінску і ў іншых кутках краіны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што галоўныя выпускны краіны гэтым разам праводзіцца ў новым фармаце. Ён заклікаў выпускнікоў не судзіць строга, калі першы раз нешта не ўдасца. У наступныя гады свята стане лепшым. «Вы ўжо не будзеце выпускнікамі, але я хачу вас запрасіць і ў наступным годзе, і потым разам са сваімі дзеткамі-выпускнікамі прыходзіць сюды і разам з імі святкаваць. Атрымаць уражанні, якія запомняцца на ўсё жыццё. Знайсці новых сяброў, а можа быць, і сустрэць свой лёс. Хоць, магчыма, вы ўжо ўсе сюды прыйшлі са сваім лёсам. Вы малайцы, у вас усё наперадзе.Заставайцеся заўсёды на хвалі імкнення да поспеху, захоўвайце сваю ўпартасць у дасягненні мэт. І няхай гэтыя мэты будуць высокімі і высакароднымі», — пажадаў Прэзідэнт.

Ён яшчэ раз паўтарыў сваю параду: «Пры любых абставінах (вы бачыце, разумныя людзі, што робіцца ў свеце) беражыце сваё, нікому не аддавайце яго, памнажайце яго. Як бы ні было складана і цяжка, беражыце. Страціце — потым не знойдзеце, не папоўніце. Не вернеце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля выступлення кіраўніка дзяржавы на сцэну выйшлі самі выпускнікі. Ад імя гасцей свята і ўсіх выпускнікоў краіны яны ўручылі Прэзідэнту памятны падарунак. Ён сімвалізуе кансалідацыю беларускага народа, захаванне і ўмацаванне ідэй міру ў Беларусі, стваральнай працы як галоўных умоў развіцця дзяржавы. Потым Аляксандр Лукашэнка разам з выпускнікамі адправіўся на назіральную пляцоўку да набярэжнай Свіслачы, каб паглядзець водна-агнявое шоу.

У Год міру і стваральнай працы галоўнай тэмай свята абрана легендарная птушка шчасця, якая сімвалізуе дабрыню і мір. Па легендзе, яе пяро дарыць удачу таму, хто яе знайшоў.

Свята каля Палаца спорту працягвалася да апоўначы. У праграме былі выступленні зорак беларускай эстрады, мастацкіх калектываў, дыджэяў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



# «НАДЫХОДЗІЦЬ ВАШ ЧАС СТВАРАЦЬ ГІСТОРЫЮ НАШАЙ КРАІНЫ»

## Прэзідэнт уручыў узнагароды выпускнікам і выкладчыкам устаноў вышэйшай адукацыі

**У Палацы Незалежнасці сабраліся найлепшыя з найлепшых. І тыя, хто штодзень сваёй плённай працай уносіць асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў і развіццё таленавітай моладзі. І тыя, хто сваімі поспехамі ў вучобе і актыўнай грамадскай дзейнасцю папаўняе скарбонку талентаў Беларусі, робіць нашу краіну яшчэ больш пазнавальнай на сусветнай арэне. Перад тым, як атрымаць узнагароды з рук кіраўніка дзяржавы, выпускнікі і выкладчыкі ВНУ азнаёміліся з гісторыяй стварэння і архітэктурна-мастацкімі асаблівасцямі рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — для іх была праведзена экскурсія.**

Як звярнуў увагу на цырымоніі ўзнагароджання Аляксандр Лукашэнка, гэты дзень з'яўляецца знамянальным і для ўдзельнікаў цырымоніі, і для краіны, і для Прэзідэнта. «Вашы дасягненні прыносяць радасць і натхняюць», — падкрэсліў ён.

Віншуючы выпускнікоў, Прэзідэнт адзначыў, што яны адкрываюць новую главу дарослага жыцця, якое, па яго словах, пачынаецца ярка і годна. «Вы робіце яшчэ толькі першы крок у прафесію, а ўжо дзеліце хвіліну славы нароўні з прафесіяналамі высокага ўзроўню, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Значыць, вы апераджаеце час. Гэта добра. Утрымацца б на гэтым шляху. Гэта вялікі давер і аванс, якія вы, абсалютна перакананы, апраўдаеце. Кожны з вас стаў найлепшым у вучобе, навуковай і грамадскай дзейнасці, спорце, творчасці. Вамі па праве могуць ганарыцца родныя, школьныя настаўнікі, выкладчыкі ВНУ».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што маладыя людзі прайшлі самы складаны перыяд у сваім жыцці. Па яго словах, цяжэй за вучобу ў жыцці больш нічога няма. Прэзідэнт пажадаў, каб далейшае жыццё сённяшніх выпускнікоў было роўным. «Вы — вялікія малайцы, але за ваш поспех найперш дзякую тым, хто падарыў вам жыццё, выгадаваў, выхаваў, вывучыў, хто стаў для вас аўтарытэтам і годным прыкладам, — бацькоў, выхавацеляў, педагогаў і адданых сяброў, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Я жадаю, каб вы дакладна так адносіліся да сваіх дзетак і вывелі іх на той жа ўзровень у гэтым узросце, у якім вы знаходзіцеся. Гэта разам з імі, з іх падтрымкай вы так упэўнена ідзяце да сваіх мар, дасягаеце пастаўленых мэт. Такой жа апорай хутка стануць для вас будучыя калегі — спецыялісты з вялікім вопытам, у якіх будзеце вучыцца далей».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што не проста вучыцца, а можа, і пераўвучвацца. Па яго перакананні, жыццё прымусіць гэта зрабіць. «Не расчароўвайцеся, калі вы ўбачыце ў новым сваім жыцці вельмі-вельмі шмат і адрозненняў ад таго, што было ў гады вучобы, — папярэдзіў маладых людзей кіраўнік дзяржавы. — Гэта нармальна. Гэта было заўсёды. Але ваша вучоба ўсё роўна будзе фундаментам, базай для будучага жыцця».

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што выпускнікі завяршылі вучобу і пачынаюць працоўны шлях у Год міру і стваральнай працы. «Няхай і будучыня ваша будзе такой — мірнай і стваральнай! — пажадаў кіраўнік дзяржавы. — Гледзячы на вас, — мэтанакіраваных, яркіх, прыгожых, маладых людзей, бачу, што наша родная Беларусь стане яшчэ найлепшай і найпрыгажэйшай. Веру, што вы зробіце дзеля гэтага ўсё».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што перад ім стаяць дарослыя, сур'ёзныя і самадастатковыя людзі, але дазволіў сабе звярнуцца да выпускнікоў па-бацькоўску: «Дарагія нашы дзеці! Вы — самае важнае, што ёсць у нашым жыцці, жыцці старэйшага пакалення. Мы заўсёды побач і будзем рабіць усё, каб вы адчувалі наша плячо і клопат, пакуль будзеце ісці да вызначаных вяршынь. Надыходзіць ваш час ствараць гісторыю нашай краіны — сваёй краіны. Няхай усё ў вас атрымаецца!»

Звяртаючыся да выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў, Прэзідэнт адзначыў, што без людзей, якія знаходзяцца ў гэтай зале, без усіх іх калег, у тым ліку школьных настаўнікаў, не было б гэтага ўзнагароджання, не было б гэтага пачуцця ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. «Я заўсёды казаў і паўтару: вы — сапраўдная апора дзяржавы, — падкрэсліў ён. — Дай бог вам сіл, натхнення і, самае галоўнае, здароўя».

Беларускі лідар папярэдзіў маладых людзей, што ў іх наперадзе — нялёгкае і вялікае жыццё. «Хачу, каб вы ніколі не шкадавалі аб тым, што ў вашым жыцці здарылася, а рабілі заўсёды годныя высновы з мінулых гадоў, дзён, гадзін пражытага жыцця, — пажадаў Аляксандр Лукашэнка. — Я заўсёды выпускнікам кажу: трэба рабіць усё своечасова, каб потым мець поспех і, пажадана, нічога не перарабляць. Не шкадуйце сябе. Вы вельмі маладыя. У вашым узросце вам усё пад сілу, потым зрабіць гэта будзе складаней. Усё ў вас наперадзе, усё ў вашых руках. Трымайце краіну моцна!»

**Вераніка КАНЮТА.**

# Новая традыцыя

## Удзельнікі «Цягніка Памяці» наведалі Гродна

**Гэта другі горад у маршруце ўнікальнага міжнароднага праекта, старт якому быў дадзены ў Брэсце. Акцыя праходзіць другі год і сёлета аб'яднала звыш 200 юнакоў і дзяўчат. У адрозненне ад леташняга падарожжа, сёлета ў ім прымаюць удзел прадстаўнікі чатырох краін — Беларусі, Расіі, Арменіі і Кыргызстана.**

Падчас прыбыцця цягніка на перон гродзенскага вакзала юныя пасажыры не хавалі эмоцый. Яны спявалі, жартавалі і ветліва сустракалі вялікі натоўп журналістаў. Сярод тых, хто прыйшоў да цягніка, былі ўдзельнікі мінулагодняга праекта. Расціслаў Сіроцкі і Андрэй Норкін расказалі, што прыйшлі падтрымаць сёлетніх удзельнікаў і прыгадаць хвалюючыя моманты леташняй паездкі. Па іх словах, цягнік стаў месцам, да якога хочацца вяртацца зноў і зноў.

— Сёлета мы наведаем 15 гарадоў Беларусі і Расіі, праедзем за 15 дзён дзевяць тысяч кіламетраў, — пазначыў расклад паездкі яе ўдзельнік, **сенатар беларускага парламента Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Два дні мы правялі ў Брэсце, і за гэты кароткі час многія паспелі пасябраваць. Наша мэта — аб'яднаць моладзь, паказаць ім праўду аб Вялікай Айчыннай вайне. Таму ў нашым маршруце нямала месцаў, звязаных з гераічным мінулым. Думаю, што гэта надоўга застанецца ў памяці ўдзельнікаў унікальнага праекта, які набыў папулярнасць не толькі сярод саміх пасажыраў цягніка, але і вялікага кола моладзі. Аб гэтым сведчыць і той факт, што ў тэлеграм-канала «Цягнік Памяці» каля 20 тысяч падпісчыкаў, якія сочаць за рухам цягніка.

За праектам назіраюць, вядома і родныя ўдзельнікаў. На вакзале цягнік сустракалі бацькі гродзенкі Маргарыты Крупіцы. Маргарыта вучыцца ў школе № 3 Гродна і ў ліку дзесяці прадстаўнікоў рэгіёна прымае ўдзел у патрыятычнай акцыі «Цягнік Памяці». Аказалася, што вандроўка цікавіць не толькі бацькоў, але і іх калег па рабоце, і, вядома, аднакласнікаў і педагогаў школы.



Знаёмімся з самімі ўдзельнікамі. Увагу журналістаў прыцягвае рослы загарэлы хлопец на пачатку калоны. Ён просіць, каб выслухалі яго прывітальнае слова на кіргізскай мове. Потым па-руску расказвае, што «Цягнік Памяці» стаў для яго вялікім дасягненнем, магчымасцю паглядзець гарады, даведацца іх гісторыю. Яго сяброўка Айдан з Кыргызстана вельмі ўзрушана гэтай падзеяй, і хаця іх дэлегацыя ўжо некалькі дзён у дарозе, яна гатова вандраваць яшчэ доўга. «Мае ўражанні пераўзышлі ўсе чаканні», — прызнаецца дзяўчына.

Арно Мкртчан прыехаў са сталіцы Арменіі Ерэвана. Вось што ён расказаў аб сваім «шчаслівым білеце»:

— Неяк я сядзеў на канапе, і тут падыходзіць мая маці і кажа: Арно, ты выйграў! Я, вядома, узрадаваўся, бо, каб сюды трапіць, даволі прыкласці намаганні. Для ўдзелу ў конкурсе напісаў эсэ аб сабе, аб маіх адносінах да гэтага праекта, аб гісторыі гарадоў, зняў відэаролік каля помніка Грыбаедава. Конкурс быў даволі вялікі, але мне пашчасціла. А галоўнае — у нас склаліся вельмі сяброўскія адносіны з прадстаўнікамі ўсіх краін, усе мы адчуваем адзін настрой — падтрымаць патрыятычную памяць аб нашай агульнай Перамозе. Вялікі маршрут не палохае, хоць я першы раз за мяжой сваёй краіны. Галоўнае — атрымаць шмат эмоцый, ведаў і ўражанняў.

Аб гэтым марыць і Дзяніс Гадавічэнка з Данецка. Першы дзень падарожжа ў Брэсце запомніўся яму да дробязяў. Ён упэўнены, што кожны дзень будзе прыносіць штосьці цікавае і карыснае.

Гродзенцы цёпла сустрэлі пасажыраў незвычайнага цягніка. Іх ганаровую місію адзначыў у прывітальным слове намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Пранюк. Ён назваў удзельнікаў праекта валанцёрамі памяці, анёламі міру, якія нясуць ідэалы дабра і сяброўства.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Мікалая ЛАПІНА.**

---

У тэму

### УЗНАГАРОДЫ — ПА ЗАСЛУГАХ

Сваімі эмоцыямі пасля ўручэння ўзнагароды падзялілася **дэкан медыка-дыягнастычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта Ірына НАЗАРАНКА**.



Фота БелТА.

«Мая ўзнагарода — заслуга выкладчыкаў нашай установы адукацыі, — адзначыла яна. — Сфера аховы здароўя і адукацыі вызначаюць грамадства: здаровую і адукаваную нацыю». Нягледзячы на кіруючую пасаду (Ірына Назаранка — самы малады дэкан у Рэспубліцы Беларусь), яна практыкуючы ўрач. «Я вельмі рада, што магу рыхтаваць медыцынскія кадры ў галіне медыцынскай візуалізацыі для ўсёй краіны, — адзначыла дэкан. — Нашы выпускнікі — адны з самых практыкаарыентаваных, якія працуюць на высокатэхналагічным абсталяванні. Прэзідэнт удзяляе вялікую ўвагу дыягностыцы сацыяльна значных захворванняў. Наш факультэт у гэтым плане займае лідарскія пазіцыі ў падрыхтоўцы дадзеных кадраў. У планах — працяг развіцця навуковых школ у Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, яшчэ большая мадэрнізацыя адукацыйнага працэсу, укараненне інавацыйных формаў, каб нашы выпускнікі былі самымі лепшымі і канкурэнтаздольнымі на сусветнай арэне».

Як расказаў у размове з карэспандэнтам «Звязды» **выпускнік агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі лейтэнант Міхаіл ВЕЖНАВЕЦ**, ён з самага дзяцінства планаваў сваё далейшае жыццё. Атрымаць афіцэрскія пагоны — самая запаветная мара юнака. «Я заўсёды бачыў сябе ў пагонах, чалавекам, які абараняе сваю краіну, — удакладніў Міхаіл. — Якія цяжкасці ні ўзнікалі б на маім шляху, я ніколі не пакідаў ідэю аб тым, што я — будучы абаронца сваёй Айчыны». Міхаіл — уладальнік Прэзідэнцкай стыпендыі, залаты медаліст. У свой зусім юны ўзрост у хлопца немалыя дасягненні ў навуцы і спорце. Па заслугах — і Падзяка Прэзідэнта.

Яшчэ адзін будучы афіцэр атрымаў з рук кіраўніка дзяржавы ўзнагароду. **Выпускнік факультэта крымінальнай міліцыі Акадэміі МУС Павел ПРАТАШЧЫК** — пераможца двух рэспубліканскіх алімпіяд, курсант года ў намінацыі «Малады вучоны», аўтар двух навуковых работ. Неўзабаве малады чалавек прыйдзе на першае месца службы — у адно са сталічных РУУС, дзе ён ужо праходзіў практыку. Дарэчы, нават за гэты кароткі перыяд Павел выявіў тры злачынствы ў эканамічнай сферы. «Стаць міліцыянерам было цалкам маім жаданнем, бацькі мяне падтрымалі, з дзяцінства яны прывівалі мне пачуццё патрыятызму, таму гэтая ўзнагарода ў тым ліку і іх, — заўважыў малады чалавек. — Ад службы чакаю цікавых падзей, звязаных з маёй прафесійнай дзейнасцю. Настрой баявы».

---

Эканоміка

# Стаўка рэфінансавання зніжаецца да 9,5 % гадавых

**Згодна з рашэннем Праўлення Нацыянальнага банка, з 28 чэрвеня стаўка рэфінансавання зніжаецца з 9,75 % да 9,5 % гадавых, стаўка па крэдыце авернайт — з 10,75 % да 10,5 % гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — з 8,75 % да 8,5 % гадавых.**

Як адзначылі ў прэс-службе Нацбанка, захоўваецца тэндэнцыя запавольнення інфляцыйных працэсаў. У маі спажывецкія цэны знізіліся адносна красавіка бягучага года на 0,3 %. На гэтым фоне паказчык гадавой інфляцыі паменшыўся да 3,7 % з 4,7 % месяцам раней. Захоўваецца таксама ўстойлівая дынаміка да запавольнення асноўных кампанентаў індэкса спажывецкіх цэн. Гадавая базавая інфляцыя запаволілася да 3,3 % з 4,6 % у папярэднім месяцы, трэндавая інфляцыя — да 3,4 % з 4,6 %. У найбліжэйшыя месяцы на фоне чаканых нізкіх месячных значэнняў інфляцыі паказчык гадавога прыросту спажывецкіх цэн не перавысіць узровень 5 %.

Працягваецца аднаўленне беларускай эканомікі, адзначылі ў Нацбанку. Падтрымку росту ВУП аказвае паступовае павелічэнне ўнутранага спажывання, якое суправаджаецца супастаўным ростам прапановы тавараў і паслуг. Пашырэнне плацежаздольнага попыту падтрымліваецца за кошт крэдытных рэсурсаў банкаў у нацыянальнай валюце, даступнасць якіх для арганізацый і грамадзян павысілася на фоне зніжэння працэнтных ставак.

Праінфляцыйныя рызыкі па-ранейшаму ацэньваюцца як умераныя. Застаюцца павышанымі тэмпы прыросту рублёвай грашовай масы, што шмат у чым звязана з працэсамі дэвалютызацыі эканомікі. Адначасова захоўваецца высокая доля ліквідных актываў у структуры грашовых зберажэнняў насельніцтва ва ўмовах стрыманай ашчаднай актыўнасці грамадзян.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нарэндра Модзі лічыць, што Індыя стане трэцяй эканомікай свету

Індыя хутка стане трэцяй эканомікай свету, заявіў прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі, выступаючы на сумеснай сесіі кангрэса ЗША, паведаміла РІА «Навіны». «Калі я ўпершыню наведаў ЗША ў якасці прэм'ер-міністра, Індыя была дзясятай па велічыні эканомікай у свеце. Сёння Індыя займае пятае месца па велічыні эканомікі. Індыя хутка стане трэцяй па велічыні эканомікай у свеце. Мы не толькі становімся большымі, але і расцём хутчэй. Калі Індыя расце, расце і ўвесь свет», — заявіў Модзі. Індыйскі прэм'ер знаходзіцца ў ЗША з афіцыйным дзяржаўным візітам. «У мінулым стагоддзі, калі Індыя заваявала свабоду, мы складалі шостую частку насельніцтва зямнога шара. Гэта натхніла многія іншыя краіны на вызваленне ад каланіяльнага панавання. У гэтым стагоддзі, калі Індыя ўсталюе арыенцір у эканамічным росце, гэта натхніць многія іншыя краіны зрабіць тое ж самае», — адзначыў Нарэндра Модзі.

### Аператар зніклага батыскафа аб'явіў экіпаж «Тытана» загінулым



Экіпаж батыскафа «Тытан», які прапаў у Атлантычным акіяне, загінуў. Пра гэта гаворыцца ў заяве кампаніі OceanGate Expeditions — уладальніка апарата, паведаміла РІА «Навіны». Пацвердзіў інфармацыю таксама прадстаўнік берагавой аховы ЗША Джон Могер. Паводле яго звестак, у батыскафе «адбыўся катастрафічны накіраваны ўнутр выбух». Гэта пацвярджаюць абломкі, знойдзеныя больш чым за 200 метраў ад патанулага судна. На месцы надзвычайнага здарэння працуюць глыбакаводныя апараты, якія збіраюць дадатковыя даныя. Верагоднасць выявіць астанкі загінулых невысокая з-за вялікай глыбіні і складанасці работы на ёй, і гэта прызнаюць удзельнікі пошукавай аперацыі, дадаў Могер. Сувязь з глыбакаводным суднам, якое дастаўляла турыстаў да месца гібелі «Тытаніка», знікла 18 чэрвеня. Гэта адбылося прыкладна праз гадзіну і 45 хвілін пасля апускання. На борце былі брытанскі мільярдэр Хаміш Хардынг, ветэран глыбакаводных даследаванняў з Францыі Поль-Анры Наржоле, заснавальнік амерыканскай кампаніі, якая здзейсняе экскурсіі да абломкаў «Тытаніка», Стоктан Раш, а таксама пакістанскі бізнесмен Шахзада Давуд і яго сын.

### Прэзідэнт Бразіліі заклікаў прамыслова развітыя краіны аплаціць гістарычны даўгі



Прэзідэнт Бразіліі Луіс Інасіу Лула да Сілва заявіў, што менавіта прамыслова развітыя краіны нясуць асноўную гістарычную адказнасць за забруджванне навакольнага асяроддзя і таму павінны кампенсаваць нанесеную Зямлі шкоду, паведаміла ТАСС. «Не афрыканскія народы забруджвалі свет, не лацінаамерыканцы забруджвалі свет. Праўда ў тым, што на працягу апошніх 200 гадоў планету забруджвалі тыя, хто ажыццявіў прамысловую рэвалюцыю. І таму яны павінны аплаціць свой гістарычны доўг перад планетай Зямля», — падкрэсліў бразільскі лідар. Раней прэзідэнт Бразіліі неаднойчы адзначаў, што барацьба са зменамі клімату з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці яго ўрада. Лула да Сілва таксама ўказваў на тое, што развітыя краіны так і не рэалізавалі сваё абяцанне выдзяляць з 2020 года дзяржавам, якія сталі на шлях развіцця, штогод па $100 млрд на барацьбу з наступствамі змяненняў клімату.

Прыклад для пераймання

# СЛЕД НА ЗЯМЛІ

## Як сямейная дынастыя фермераў мяняе да лепшага жыццё ў сваёй вёсцы

**У Дзешчанцы, што на Уздзеншчыне, я апошнім часам была ў камандзіроўках па зваротах чытачоў двойчы. І абодва разы ад розных людзей чула адно і тое ж прозвішча — Лойка. Пра гэту сямейную дынастыю ўсе адгукаліся з павагай і ўдзячнасцю. І нядзіўна, бо мясцовыя фермеры не толькі думаюць пра ўласны дабрабыт, але і ўкладваюць нямала сіл, часу і грошай у развіццё малой радзімы. І плён навідавоку: сюды пераязджае жыць моладзь не толькі з Узды, але і з Мінска.**

**Сярод апошніх добрых спраў Лойкаў — прыборка стыхійнай звалкі і закладанне на яе месцы сквера з паркам камянёў, устаноўка сучаснага мемарыяла ў гонар спаленай фашыстамі вёскі Старына, памятных знакаў хлебу ды бульбе. Ідэйным куратарам гэтых праектаў быў у сваe 80 з хвосцікам асабіста Вадзім Вікенцьевіч Лойка. На жаль, сустрэцца з ганаровым грамадзянінам Уздзеншчыны, неабыякавым да лёсу сваёй вёскі, я не змагла, бо ў той дзень, калі прыязджала, ён крыху прыхварэў. Але «вы не пeражывайце, — супакоіў па тэлефоне, — сын і ўнук зараз падыдуць да помніка бульбе, яны пра яго і пра мяне ўсё ведаюць».**



Юрый і Ілья ЛОЙКІ з кнігай Вадзіма Вікенцьевіча «След на зямлі» побач з адным з такіх «слядоў» — памятным знакам бульбе.

### ЗВОН, ЯК У ХАТЫНІ

Перад тым, як пазнаёміцца з сынам і ўнукам Вадзіма Вікенцьевіча, старшыня Дзешчанскага сельвыканкама завязіў мяне на месца, дзе раней знаходзілася вёска Старына. Яна была цалкам спаленая фашыстамі разам з 47 мірнымі жыхарамі ў пачатку студзеня 1942 года. Пасля вайны так і не адрадзілася. Паводле слоў Уладзіміра Балцянкова, у памяць аб той страшнай трагедыі да нядаўняга часу стаяў стары, непрыглядны помнік. Два гады таму пры фінансавай і ідэйнай падтрымцы сям'і Лойкаў на яго месцы з'явіўся 26-тонны валун-абеліск. А побач з ім — мемарыяльны звон, трывожныя гукі якога нагадваюць, наколькі важна захаваць мір. Падобны, толькі большы, вісіць у Хатыні. «Дарэчы, маляўнічы валун Вадзім Вікенцьевіч сам адшукаў у лесе за некалькі кіламетраў адсюль. Ён амаль цалкам быў пад зямлёй, толькі верхавіна тырчала». Валун адкапалі, даставілі на месца сённяшняга мемарыяла і прымацавалі таблічку з памятным надпісам. Па перыметры ў якасці агароджы паставілі некалькі дзясяткаў адшліфаваных камянёў, а паміж імі высадзілі 90 елачак. Акрамя таго, насупраць мемарыяла заклалі ліпавую алею, як сімвал вечнага жыцця. Дарэчы, цяпер побач з гэтым месцам актыўна разрастаецца вёска Валодзькі.

### ТРЫ СВЯТЫНІ Ў БЕЛАРУСАЎ: ХЛЕБ, СОЛЬ, БУЛЬБА НА АБРУСАХ

І вось мы пад'язджаем да памятнага знака бульбе. У яго аснове таксама валун. Сімвалічна, што сам камень знайшлі на полі, дзе доўгі час вырошчвалася бульба.

«Дзешчанку называюць бульбяной сталіцай нашай краіны, — кажа сын Вадзіма Вікенцьевіча Юрый. — І тое не выпадкова, бо на тэрыторыі сучаснага аграгарадка доўгі час была славутая эксперыментальная база саўгаса імя Суворава, дзе вырошчвалася насенне для новых элітных сартоў бульбы. Тата кіраваў гэтай гаспадаркай амаль 30 гадоў. І ўжо на пенсіі заўважыў, што ў нашай краіне не аддадзена належная пашана бульбе, дзякуючы якой выжылі пасляваенныя пакаленні. Ён не па чутках ведае і часта згадвае, як вяскоўцы збіралі гнілыя, мёрзлыя «пышкі» на полі і тым самым ратаваліся ад голаду. Некалькі гадоў таму падчас чарговай хвалі настальгіі тата прапанаваў: «А давай насупраць школы *(дзе, дарэчы, знаходзіцца адзіны ў нашай краіне Музей бульбы, рэпартаж з якога чытайце ў найбліжэйшых нумарах «Звязды». — **Аўт.**)* усталюем памятны знак бульбе. Падабралі са старшынёй сельсавета годнае месца, выраўнялі пляцоўку і пачалі думаць, як ён мог бы выглядаць...»

«Мы з Вадзімам Вікенцьевічам вырашылі зрабіць аснову з валуна, бо помнікі з часам разбураюцца, а камень будзе стаяць вечна, — кажа старшыня сельвыканкама Уладзімір Балцянкоў. — Мала таго, што догляд яго мінімальны, дык і глядзіцца ён вельмі каларытна. А зверху на валун усталявалі кошык з бульбай, адліты з бронзы. Варыянты памятнаму знаку прапаноўвалі мясцовыя жыхары. Сярод іх і гіганцкі клубень, і дабрак-бульбаш у саламяным капелюшы. Але ў выніку большасць прагаласавала за поўны кошык бульбы, бо ён сімвалізуе дастатак у доме. А каб не згубіць гэты дастатак — падклалі пад яго ручнік з металу. У маім дзяцінстве хлеб заўсёды наразалі на ручніку, бо, не дай бог, крошка ўпадзе на падлогу! Гэта ж грэх. А бульба ж — наш другі хлеб. Хочам яшчэ ўдасканаліць гэты памятны знак, бо якая ж бульба без каларадскага жука *(усміхаецца)*. Таму ў перспектыве, магчыма, адальём яго з металу і «пасадзім» дзесьці збоку на валун».



Вадзім ЛОЙКА з сынам Юрыем.

Пасля адкрыцця ўнікальнага памятнага знака ў Дзешчанцы пачалі штогод па восені ладзіць «Бульба-фэсты». І неяк сама сабой з'явілася мясцовая прыкмета. Кажуць, што калі пацерці бронзавы ручнік, то на стале заўсёды будуць хлеб, соль і, само сабой, бульба. «Прыедзьце ў Піцер, напрыклад, дык там усе падобныя помнікі зацёртыя на шчасце да бляску турыстамі, — кажа Уладзімір Балцянкоў. — Паколькі апошніх у нас пакуль не так шмат, трэба рабіць стаўку на сваіх людзей. Я ўжо казаў дзяўчатам з нашага цэнтра вольнага часу, што трэба не толькі для маладажонаў, але і для школьнікаў прыдумаць легенду: накшталт, калі 1 верасня пацерці ручнік, то год будзе багаты на добрыя адзнакі».

Менавіта па ініцыятыве Вадзіма Вікенцьевіча побач з памятным знакам бульбе сёлета пасадзілі яркія кветкі. Ён сам асабіста сочыць, каб іх пастаянна палівалі ды прапалвалі, бо вельмі любіць парадак ва ўсім. І не праміне магчымасці праехаць на машыне па вёсцы. Яго любімая фраза: «Добры араты не той, хто арэ, а той, хто пасля любуецца сваёй працай». У гэтай народнай мудрасці закладзены глыбокі сэнс. Бо любавацца вынікам сваёй працы можна толькі тады, калі ўсё ад пачатку да канца зроблена дасканала, на сумленне.

«Тата якраз з кагорты такіх людзей, — усміхаецца Юрый. — Кажа, «еду па Дзешчанцы — цешуся тым, да чаго прыклаў руку, — і адчуваю сябе значна лепш». Гэта яго сакрэт энергічнасці і бадзёрасці духу». Калі заўважае, што нешта недароблена, адразу ж тэлефануе старшыні сельсавета (у іх склаўся добры тандэм і ўзаемаразуменне), каб падказаць, дзе яшчэ трэба навесці прыгажосць. І не проста падказвае, але і ахвотна дапамагае працоўнай сілай, тэхнікай і фінансава. Бо перакананы, што моцная гаспадарка павінна спрыяць якаснаму жыццю на вёсцы, паказваючы прыклад іншым. «Тата заўсёды, колькі сябе памятаю, — дадае Юрый Лойка, — задаваў сабе пытанне: «Чым я магу быць карысны людзям?» І нас, сваіх дзяцей і ўнукаў, гэтаму вучыць».

### ФОРМУЛА ШЧАСЦЯ

Помнікі, пра якія я распавяла, — толькі апошнія добрыя справы сям'і Лойкаў на карысць вёскі. Мясцовыя ж жыхары згадваюць, як у 1970-х гадах Вадзім Вікенцьевіч прыйшоў у Дзешчанку працаваць старшынёй саўгаса імя Суворава. Гаспадарка ў той час была адстаючай. Але Вадзім Лойка здолеў за лічаныя гады падняць яе да перадавых паказчыкаў. Пры ім эксперыментальная база імя Суворава грымела на ўвесь Савецкі Саюз, саўгасу быў прысвоены ганаровы статус «Гаспадарка высокай культуры земляробства». Па элітнае насенне бульбы і каб пераняць досвед, сюды прыязджалі нават з-за мяжы.

Разам з саўгасам развівалася і сама вёска. Раней яна ўяўляла сабой адну вуліцу і купку сціплых хат. Пры Вадзіме Вікенцьевічу ў чыстым полі выраслі сотні дыхтоўных дамоў для маладых спецыялістаў, сем'яў рабочых і сельскай інтэлігенцыі. З цэнтральным газаправодам, водаправодам, каналізацыяй, асфальтаванымі вуліцамі. Была пабудавана школа, дзіцячы садок, амбулаторыя, спартыўны комплекс і клуб, каб моладзі было дзе бавіць вольны час. І нават... гандлёвы цэнтр, бо раней у вёсцы працавала адна крама, унутр якой маглі зайсці 3-4 чалавекі. Астатнім даводзілася стаяць у чарзе на вуліцы пры любым надвор'і.



Абноўлены два гады таму на сродкі мясцовых фермераў Лойкаў помнік спаленай у вайну вёсцы Старына.

Вадзім Вікенцьевіч часта ездзіў у камандзіроўкі за мяжу. Усё цікавае, унікальнае, што бачыў, стараўся рэалізаваць у Дзешчанцы. У прыватнасці, праект школы з прасторным фае ды шыкоўнай лесвіцай на другі паверх прывёз з Прыбалтыкі. Прынамсі, я ўпершыню бачыла, каб у школьнай спартзале быў балкон для гледачоў.

«Вадзім Вікенцьевіч запрасіў у Дзешчанку архітэктара з Літвы, які намаляваў яму праект вёскі, — удакладняе Уладзімір Балцянкоў. — Менавіта згодна з гэтым праектам і будавалі вуліцы, камунікацыі. Усё ад пачатку было вельмі скрупулёзна прадумана. Таму цяпер толькі бяры і ўдасканальвай. Вадзім Вікенцьевіч хацеў зрабіць нашу вёску адной з узорных у рэспубліцы. І гэта яму ўдалося. Нядзіўна, што Дзешчанка — адна з першых у краіне атрымала статус аграгарадка».

...Вадзім Лойка не з тых, хто можа доўга сядзець без справы. Таму, калі выйшаў на пенсію, разам з сынам, які якраз у той час скончыў аграрны ўніверсітэт, вырашыў заняцца фермерствам, якое тады толькі зараджалася (Вадзім Вікенцьевіч і цяпер, у свае 84 гады, галоўны дарадца ў сямейным бізнесе. — **Аўт.**). Пачыналі са 100 гектараў зямлі — сёння ж фермерская гаспадарка «Алімп-Агра» вырошчвае пшаніцу, бульбу, моркву, буракі, капусту, цыбулю на 400 гектарах. Паколькі ўраджайнасць тут высокая, то і заробкі належныя, таму мясцовыя жыхары ахвотна ўладкоўваюцца да фермераў на працу. А якасная «алімпійская» гародніна карыстаецца вялікім попытам. Па яе, кажуць, на традыцыйных восеньскіх кірмашах стаяць чэргі машын. Ахвотныя купіць экалагічную і недарагую бульбу прыязджаюць у Дзешчанку з Мінска і з суседніх раёнаў. А яшчэ фермерская гаспадарка бясплатна забяспечвае гароднінай мясцовую школу і дзіцячы садок.

Самым галоўным дасягненнем Вадзіма Лойкі лічу тое, што яму ўдалося прывіць любоў да родных мясцін і цікавасць да працы на зямлі не толькі свайму сыну Юрыю, але і ўнуку Ілы. Пасля заканчэння біялагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта малады чалавек вярнуўся ў родную Дзешчанку, захапіўся аграноміяй і ахвотна працягвае сямейную справу, працуе ў фермерскай гаспадарцы таты.

Юрый і Ілья прыйшлі на сустрэчу са мной не з пустымі рукамі — прынеслі кнігу «След на зямлі», якую напісаў Вадзім Вікенцьевіч. «Тата любіць паўтараць, што для яго заўсёды было вельмі важным пакінуць светлы след на зямлі. Гэта яго формула шчасця, якую ён перадаў, як эстафетную палачку, спачатку мне, а потым і майму сыну. Ён не толькі прывіў разуменне, што трэба мяняць да лепшага месца, дзе жывеш, але і заклаў у нас «струнку», што справа, распачатая кімсьці, не павінна патухнуць».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*Уздзенскі раён.*

# ЖЫВЫЯ ВІТАМІНЫ

## Не прапусціце ягадны сезон!

**Сезон ягад сёлета пачаўся дастаткова рана, кажуць прадаўцы на знакамітым сталічным рынку Камароўцы. Уся справа ў надвор'і. Але размова — аб клубніцах і чарэшнях. З чарніцамі, напрыклад, справы ідуць не так радасна. Зрэшты, ягады на беларускіх рынках цяпер у вялізным асартыменце. Ужо ёсць нават першая вішня — праўда, неверагодна кіслая, затое па пяць рублёў за кіло. Такім чынам, прыцэньваемся да вітамінаў.**

### КЛУБНІЦЫ: У АСНОЎНЫМ З БРЭСТЧЫНЫ

Клубнічны сезон адкрыўся ў Мінску літаральна ў першы тыдзень лета, а ў больш паўднёвых раёнах краіны — дык і яшчэ раней. Словам, трускалкі паспелі надакучыць. Цалкам чакана, чым бліжэй да сярэдзіны лета, тым яны становяцца таннейшымі. Цяпер беларускія клубніцы (у асноўным з Брэсцкай вобласці) можна знайсці нават па 4 рублі за кіло. Калі летась на рынках сталіцы была вялікая прапанова грэчаскіх клубніц, то сёлета рынак захапілі ягады айчынныя. Але клубніцы — якраз той выпадак, калі пакупнік свядома абірае «купляць беларускае» — галасуе рублём за айчыннага вытворцу.

— Звыклы з дзяцінства смак, — дзеліцца пакупніца-пенсіянерка, якая прыйшла на рынак набыць «жывыя вітаміны» для ўнукаў. — І потым, клубніцы вельмі дрэнна захоўваюцца — значыць, чым бліжэй яны выраслі, тым больш экалагічна чыстыя і бяспечныя. Адлегласць, я думаю, дазваляе давезці ягады нават з Лунінца без апрацоўкі.

Сёлета з ураджаем клубніц, мяркуючы па камароўскіх радах, усё ў парадку. Хаця дачнікі скардзяцца, а навукоўцы Інстытута пладаводства пацвярджаюць: занадта суха, і ягады з-за недахопу вільгаці на кустах дробныя. Але на рынку — клубнічнае багацце.

— Ужо бяруць клубніцы на варэнне, — распавядае прадавец Святлана. — У мінулую пятніцу ўсе вёдрамі ягаду куплялі. Танней наўрад ці будзе.

Напярэдадні клубнічнага сезона, заўважым, цэны традыцыйна зноў падымаюцца — калі прапанова становіцца меншай. Цэны на клубніцы сёлета не зашкальваюць. Шчодра і ад душы прапануюць пакупніку ягаду з Лунінца і Бярозы — у сярэднім 4,50 за кілаграм. Драгічынская ягада даражэйшая — ёсць і па 5,50, і па 6,50, і па 7,50. Хаця цана залежыць не ад рэгіёна, а ад памеру ягад. Самы бюджэтны са знойдзеных мной у будні дзень на Камароўцы варыянтаў клубніц — 3,90 за 1 кг (ягады з Бярозы). Самы дарагі — больш за 10 рублёў за кілаграм — клубніцы вырашчаны пад Мінскам.

— А вы пакаштуйце і адразу зразумееце, адкуль такія цэны, — пераконвае прадавец. Сапраўды, клубніцы — як з карцінкі, так і просяцца на фота ў Instagram або на антураж для фотасесіі. А вось чароўнага клубнічнага водару яны не маюць. Пакупнікі ж аддаюць перавагу клубніцам духмяным і таннейшым.

— Наяўнасць моцнага паху залежыць ад сорту клубніц, — кажа прадавец, якая прадставілася Марынай Анатолеўнай. — Новыя сарты і гібрыды не такія сакавітыя, розніліся на перавозку, таму і пах слабы. Самыя духмяныя — сарты старыя. Але яны псуюцца хутчэй і з выгляду не такія прыгожыя, таму і каштуюць танней. Хаця бяруць іх часцей, чым гэтыя прыгожыя ягады. Можа, з-за цаны. А можа, справа ў настальгіі па дзяцінстве, калі клубніцы былі толькі такія — духмяныя і не занадта буйныя, — філасофстве суразмоўніца.

Яна расказвае, што працавала ў школе настаўніцай фізкультуры, а на рынак прыйшла, толькі выйшаўшы на пенсію. Смяецца, што ад капрызаў пакупнікоў не стамляецца — мець зносіны з людзьмі любіць, а пасля працы школьным настаўнікам і рынак ёй не страшны.



Лясныя суніцы са Старых Дарог: 15 рублёў за шкляначку.

Каштаваць ягаду можна, прычым, калі ў пачатку сезона кожную рэзалі на маленькія кавалачкі, каб адной хапіла дзясятку пакупнікоў, цяпер выдаюць на спробу цэлую ягадку. Усё ж такі сезон у разгары, і продажы клубніц сёння, мабыць, самыя высокія за лета. Так што, калі вы плануеце скінуць пару-тройку кілаграм, цяпер самы зручны час. «Клубнічная дыета» якраз у разгар сезона — досыць таннае задавальненне плюс маса станоўчых эфектаў. Калорый у клубніцах — мінімум, пры гэтым акрамя вытанчанасці стану ў якасці бонуса — зніжэнне рызыкі развіцця інфарктаў і інсультаў, ачыстка страўнікава-кішачнага тракту ад шлакаў, а сасудаў — ад халестэрыну, да таго ж — абарона ад анкалогіі страўніка і кішэчніка.

— Выбірайце клубніцы па латку, у якім яны ляжаць, — рэкамендуюць прадаўцы. Зрэшты, гэтыя рэкамендацыі яны даюць з году ў год: мы пра спосабы выбіраць якасныя клубніцы неяк падрабязна пісалі. Зараз проста нагадаем: кавалачкі раздушаных ягад на сценках ёмістасці, дзе ляжаць клубніцы — прыкмета таго, што яны не занадта свежыя. Ну і, вядома, у латку не павінна быць ніводнай гнілой ягадкі, інакш гнілата хутка «заразіць» і тыя ягады, што цешаць позірк. Захоўваюцца клубніцы максімум тры-чатыры дні. Жадаеце даўжэй — замарожвайце. Або варыце варэнне.

### ЧАРЭШНІ: ШЫРОКАЯ ГЕАГРАФІЯ

Бываюць гады, калі чарэшні абыходзяцца пакупніку дорага. Але гэты год не з такіх: чарэшні адносна танныя і іх шмат. Даражэйшыя за клубніцы, вядома. Але ж і везуць іх у Беларусь здалёк. Цяпер на беларускіх рынках прадстаўлены чарэшні з Узбекістана, Азербайджана, Арменіі, Малдовы.

— Самыя салодкія чарэшні — з Узбекістана, — тлумачаць прадаўцы. — Малдаўскія таксама салодкія і мяккія. Азербайджан — з кіслінкай, ягады цвёрдыя і хрумсткія. Гледзячы якія вы любіце.

Выбіраць ягады па краіне — маўляў, азербайджанскія з кіслінкай, а ўзбекскія ўсе салодкія — няўдзячны занятак. Смак ягад залежыць у першую чаргу не ад месца іх вырастання, а ад сорту — а сартоў чарэшні ў свеце налічваецца некалькі тысяч. Ад іх залежаць і сакавітасць, і саладосць, і кіслінка, і шчыльнасць. Так што каштаваць трэба. Ягадку «на спробу» многія прадаўцы вам нават спаласнуць вадой.

Сезон чарэшні сёлета пачаўся рана і неяк незаўважна: чакаць і спадзявацца не прыйшлося — ён проста «абрынуўся» на нас, і чарэшань раптам стала шмат на рынках, на латках каля прыпынкаў грамадскага транспарту і нават на стыхійных міні-рынках, на кардонных каробках у пераходах. Цэны, як ужо гаварылася, не асабліва кусаюцца: чарэшні з Малдовы прадаюць па 7,90 і 8,90 за кіло (у залежнасці ад памеру ягад). Чарэшні з Азербайджана і Арменіі ў асноўным прапануюць па 11,90—12,90 за кілаграм. Самы дарагі са знойдзеных на Камароўцы варыянтаў — 17,90 за кілаграм буйных, амаль чорных ягад з Узбекістана.

Аб свежасці чарэшань пакупніку недвухсэнсоўна раскажуць хвосцікі: яны павінны быць не сухімі, а лепш за ўсё зялёнымі. Зрэшты, хвосцікі прадаўцы часам абрываюць — не таму, што хочуць падмануць пакупніка, а каб павысіць прывабнасць свайго тавару. Сучасны прыдзірлівы пакупнік лянуецца абрываць хвосцікі сам і, здараецца, выбірае ўжо «гатовую да ўжывання» ягаду, якую застаецца толькі памыць. Спрабаваць на Камароўцы чарэшні сёлета даюць ахвотна. Каштуйце абавязкова! А звярніце ўвагу на памер костачкі: занадта вялікая сведчыць, што ягады знялі з дрэва недаспелымі і даспявалі яны ў дарозе. Што яшчэ важна не выпусціць з-пад увагі? Тое, што ягады павінны быць аднаго колеру: калі адна ягадка святлейшая, другая — цямнейшая, зноў жа, рвалі іх неспелымі. Мяркую, аб тым, што чарэшні не павінны быць мятымі або з драпінамі, казаць залішне.

Адзначым, што чарэшні — таксама выдатны варыянт для ягаднай дыеты: цукроў і вугляводаў у іх мала (нават у самых салодкіх), антыаксідантаў і вітамінаў шмат. Плюс да таго чарэшні пастаўляюць у арганізм жалеза і пазбаўляюць ад ацёкаў (у спякоту гэта асабліва актуальна). Але памятаем, што чарэшні — алерген, так што аб'ядацца не варта. Наогул, дыетолагі рэкамендуюць спажываць не больш за 200 г гэтых ягад у дзень. На крайні выпадак — не больш за 400 г.

Захоўваюцца чарэшні лепш за клубніцы: прадаўцы кажуць, у халадзільніку — да 10-14 дзён. Чарэшні, дарэчы, таксама замарожваюць (папярэдне выдаляючы костачкі). А вось варэнне з чарэшань звычайна не вараць (ва ўсякім разе, у беларускіх гаспадынь няма такой традыцыі). Лічыцца, што варэнне з гэтай ягады нясмачнае.

— Яшчэ якое смачнае! — горача пярэчыць Айдан, у якой я купляю чарэшні (яна прыехала ў Беларусь з Азербайджана). — Мая бабуля варыць такое смачнае варэнне! На кілаграм чарэшань — кілаграм цукру, 350 мл вады, лімонны сок на смак і ванілін. Дома мы гатуем такое варэнне з цэлай ваніллю (струк ванілі трэба разрэзаць уздоўж і выдаліць з яе насенне), але можна выкарыстоўваць і здробненую, з пакуначка. А лімонны сок можна замяніць на кіслы яблычны.



Чарэшань сёння на рынках шмат: з Узбекістана, Азербайджана, Арменіі, Малдовы.

Такім чынам, варым з цукру і вады сіроп, даём яму крыху астыць і кладзём у гарачы сіроп чарэшні без костачак. Дзве гадзіны ягады павінны стаяць у сіропе, затым пры памешванні даводзім варэнне да кіпення і варым на павольным агні, пакуль ягады не стануць празрыстымі. Хвілін за 3-5 да гатоўнасці ўліваем лімонны сок і кладзём ванілін. Разліваем па слоіках і атрымліваем асалоду.

### І ІНШЫЯ ЛЕТНІЯ РАДАСЦІ

Паспяваюць паціху і лясныя ягады. За паўлітра чарніц са Старых Дарог прасілі 10 рублёў. Лясныя суніцы — адтуль жа — прапаноўваліся пакупнікам яшчэ даражэй: 15 рублёў за шкляначку.

— Потым чарніцы будуць таннейшыя, — распавялі жанчыны за прылаўкам.

А вось што цяпер сярод ягад «прэміум-сегмент», дык гэта буякі — на хвіліначку, 48-49 рублёў за кіло. Буякі пакуль іспанскія. Беларускія будуць таннейшая, кажуць прадаўцы. Тым больш што ў краіне актыўна развіваецца вытворчасць гэтых ягад. Проста на іх пакуль «не сезон»: у нашай кліматычнай зоне буякі масава выспяваюць у жніўні. А ў чэрвені цэны на іх вось такія.

— Чаму не бяруць? Бяруць! — абураецца майму пытанню прадавец. — Проста бяруць не кілаграмамі. Бачыце, у нас па 200 грамаў ягады расфасаваныя. Гэта як БАД, толькі натуральныя.

У асноўным сёння бяруць буякі для дзяцей, пажылых бацькоў, людзей, што выздараўліваюць, тлумачыць суразмоўніца. Гэтыя ягады сапраўды скарбніца здароўя — яны багатыя вітамінамі C, K, E, у іх утрымліваецца жалеза для крывятварэння, фосфар для мозгу, магній і калій для сэрца. Пры рэгулярным ужыванні яны прадухіляюць сардэчна-сасудзістыя захворванні, паляпшаюць здароўе мозгу і зніжаюць цукар у крыві. Для дасягнення станоўчага эфекту дастаткова з'ядаць штодня 15—20 ягадак. Ну, а максімум для дарослага ў дзень — 200 г буякоў, больш не трэба: карысныя рэчывы не засвояцца.

Працягваючы тэму ягад, прыцэньваюся яшчэ і да кавуноў — гэта ж таксама ягада, толькі гіганцкая. І цудоўны прыродны дэтокс: дыетолагі рэкамендуюць кавуновыя разгрузачныя дні. Цэны на кавуны пакуль не сказаць, каб нізкія: ад 4,90 да ажно 7 рублёў за кіло. Да таго, каб цэлыя рады на Камароўцы былі «акупаваны» кавунамі, пакуль далёка. Гэта будзе пазней, калі да нас масава прыедуць, як бывае кожнае лета, кавуны з Казахстана. Пакуль кавуны ў асноўным іранскія, іх з году ў год прадаюць у Беларусі на пачатку лета. Попыту асабліва на іх пакуль няма з-за высокай цаны і састарэлага, як сцвярджаюць прадаўцы, пераканання, што раннія кавуны — гэта «адны нітраты».

— Гэта няпраўда. Так было раней, сёння кавуны да нас вязуць з многіх краін, дзе яны паспяваюць у розныя тэрміны, — распавядае ўсходняга выгляду прыгажун за прылаўкам. Загледзеўшыся на яго белазубую ўсмешку, згаджаюся пакаштаваць кавалачак кавуна. Сапраўды, смачна. Але дорага: адзін паласаты «мячык» абыдзецца вам рублёў у 35.

Ну, а працягваючы тэму дароў лесу, дадамо, што на рынках ужо ёсць лісічкі: яркія, духмяныя і дарагія. У шкляначку ўваходзіць літаральна 10 грыбочкаў, і просяць за яе 10 рублёў. Што зробіш, у лясах суха, разводзяць рукамі прадаўцы. Калі пойдуць дажджы, лісічак стане больш, а цэны на іх — ніжэйшымі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.**

### У тэму

### ЯКІ ПРАГНОЗ НА ЎРАДЖАЙ?

— Умовы надвор'я ўносяць свае карэктывы ў чаканні садаводаў, — адзначае **загадчыца лабараторыі генетычных рэсурсаў ягадных культур, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ягадных культур РУП «Інстытут пладаводства», кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Людміла ФРАЛОВА**. — У гэтым годзе ягады драбнейшыя, таму што расліны атрымліваюць менш вільгаці. Тыя ж суніцы садовыя (клубніцы, як іх прынята называць) цяпер вырастаюць досыць дробнымі, іх не надта шмат на адной расліне, і ў цэлым па вазе ўраджай меншы, чым чакалі дачнікі зыходзячы з папярэдніх гадоў. Дробныя чакаюцца сёлета і летнія маліны. А ў цэлым, калі ў ліпені надвор'е выправіцца, калі пройдуць ліўні, то ўраджай парэчак, рэмантантных малін, ажын, буякоў — тых ягадных культур, тэрміны паспявання якіх — жнівень, не пацерпіць.

# 40 ГАДОЎ РАЗАМ

## Жыхарка з Клічава сабрала амаль увесь прызавы фонд газеты «Звязда»



**Цяжка ўявіць больш адданага газеце падпісчыка, чым Зоя САМЕЦ. Яна не здраджвае газеце на працягу сарака гадоў. Прычым не толькі выпісвае і чытае яе, але яшчэ і рэкламуе і папулярызуе сярод мясцовага насельніцтва. Ведае па імёнах (а кагосьці і асабіста) амаль усіх аўтараў выдання, захоўвае тое, што больш спадабалася, у вырazках і ўжо падрыхтавала чарговы купон, каб паслаць на конкурс падпісчыкаў. А можа, зноў штонебудзь выйграе?**

### ВЫДАННЕ ДЛЯ ПАТРЫЁТАЎ

— «Звязда» — мая любімая газета, і гэта не проста словы, — кажа суразмоўніца. — Пазнаёмілася з ёй яшчэ задоўга да таго, як стала яе пастаяннай чытачкай. У нашай вёсачцы Каўбчанская Слабодка яе шмат хто выпісваў. І чыталі з задавальненнем. Мая цётка таксама. Помню, як мне, тады яшчэ шасцікласніцы, выданне трапіла на вочы. Газеты тады былі чорнабелыя, і запомнілася напісаная чорным шрыфтам назва — «Звязда». Зацікавіла, што матэрыялы там былі на беларускай мове. Гэта мова для мяне родная. Нават калі на рускай размаўляю, ужываю беларускія слоўцы.

У канцы 1960-х дзяўчына з клічаўскай вёсачкі, што на беразе ракі з прыгожай назвай Вольса, адправілася ў Мінск паступаць у інстытут імя М. Горкага (цяпер універсітэт імя М. Танка). На спецыяльнасць «Настаўнік пачатковых класаў», якую абрала, конкурс быў тры чалавекі на месца. Для жыхароў сельскай мясцовасці трэба было набраць 15 балаў (па пяцібальнай сістэме). Сачыненне і гісторыю Зоя здала на чацвёркі, матэматыку — на тройку, а вось па беларускай мове і літаратуры атрымала самы высокі бал — «пяць». Выкладчыкі задавалі ёй розныя пытанні і не маглі паверыць, што такія грунтоўныя веды яна атрымала ў вясковай школе.

— А я ў думках дзякавала маёй любімай настаўніцы Ганне Крыштан, якая і сама любіла, і нам перадала любоў да роднай мовы, — кажа суразмоўніца. — Сёння маёй вёсачкі амаль ужо няма. Але па-ранейшаму шмат хто з раёна едзе туды ў лес па грыбы і ягады. Іх там заўсёды процьма. Мясціны найпрыгажэйшыя. Люблю сваю радзіму, свой родны куточак, таму і прыехала сюды пасля заканчэння ВНУ. Хоць магла б нядрэнна працаўладкавацца бліжэй да Мінска — у Пухавіцкім раёне, бо ўваходзіла ў дзясятку найлепшых па паспяховасці.

Першыя два гады маладая настаўніца працавала ў Закуцкай васьмігодцы. Вельмі хацела выкладаць у пачатковых класах, але ў раённым аддзеле адукацыі цвёрда сказалі, што патэнцыял дыпламаваных спецыялістаў вышэйшы, і адразу ж накіравалі выкладаць матэматыку, рускую і нямецкую мовы. Нямецкую мову яна на той час ведала вельмі добра. За гэта ўдзячна яшчэ аднаму настаўніку — ветэрану вайны Міхаілу Фельдману. Ён дагэтуль жывы. Адзіны ветэран вайны ў раёне застаўся. Потым была Бёрдаўская школа, дзе выкладала ў 4-5 класе матэматыку і рускі. Адтуль трапіла ў метадычны кабінет раённага аддзела адукацыі, была інспектарам. На той час, у 1975 годзе, у раёне было 42 пачатковыя школы, 9 васьмігодак і 12 сярэдніх. З 1978 года жанчына працавала адказным сакратаром таварыства «Веды», а потым лектарам і намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі райкама партыі.

— Гэта была добрая школа падрыхтоўкі ідэалагічных кадраў, — расказвае Зоя Іванаўна. — Я займалася падпіскай выданняў і па сабе ведаю, якую важную ролю выконваюць у выхаванні патрыётаў газеты. З тых часоў і стала пастаянным падпісчыкам газеты «Звязда». Сёння выданне для мяне яшчэ больш каштоўнае, бо адзінае з грамадска-палітычных, на беларускай мове ад пачатку да канца. Падабаецца кампаноўка газеты. Цяпер на першай паласе калонка навін пазначана «Коратка», раней быў «Розгалас». Тут жа пачатак галоўнага матэрыялу нумара. Тэма заўсёды цікавая і актуальная. Інфармацыя падаецца проста, без навязвання пэўнага меркавання. У матэрыялах прысутнічае аналітыка і глыбіня. Не вельмі падабаецца, што шмат рэкламы, але разумею, што гэта павеў часу.

### ЦЁПЛЫЯ СУСТРЭЧЫ

Зоя Іванаўна прыйшла на сустрэчу з цэлым пакетам выразак. Усміхаецца: гэта тое, што трапіла пад руку. У яе захоўваюцца нумары 90-х гадоў. Артыкулы «Звязды» можна перачытваць бясконца. Яны актуальныя заўсёды. Вось толькі не хапае часу ўпарадкаваць увесь гэты друкаваны скарб. «Крынічка», «Хатняя энцыклапедыя», «Краіна здароўя», «Ігуменскі тракт», «Жырандоля», літаратурная старонка, «Фотаслова Яўгена Пясецкага», аўтарскія калонкі Святланы Яскевіч «Нефармат», Алены Ляўковіч «Неасабісты суб'ектыў», Валянціны Доўнар «Простая мова» і «Алё! Народ на провадзе» — гэтыя рубрыкі і аўтары яе любімыя. Прызнаецца, што апошнім часам вельмі закранулі праекты «Абеліскі» і «Спаленыя вёскі».



Асабіста пазнаёміцца з аўтарамі «Звязды» Зоі Іванаўне пашчасціла ў сярэдзіне 90-х, калі працавала ў райсавеце дэпутатаў. Тады ў раён прыехалі адразу некалькі чалавек, каб наведаць гаспадаркі і напісаць аб працаўніках. Быў сярод іх і Яўген Пясецкі, чые лірычныя фотазамалёўкі яна захоўвае асобна. Успомнілася гісторыя і з Анатолем Клешчуком, які аднойчы прыехаў у Клічаў пад вечар і прасіў Зою Іванаўну арганізаваць яму сустрэчу ў каледжы. Па дарозе ім сустрэўся цікавы конны экіпаж, на які ў Клічаве ніхто ўвагі не звяртаў, а ў фотамайстра гэта выклікала вялікае захапленне. Так канявод Пётр, які развозіў тавары для грамадскага харчавання на калёсах, стаў мясцовай славутасцю.

Ну, а калі ў другой палове 1990-х у газеце з'явілася ўкладка «Мясцовае самакіраванне», Зоя Іванаўна стала весці ўлік гэтым нумарам.

— Для дэпутатаў Клічаўскага раёна, а я працавала ў райсавеце галоўным спецыялістам, «МС» адразу ж стала настольным кіраўніцтвам, — кажа яна. — Гэта быў практычны дапаможнік для нашай работы. Там і пра арганізацыйныя пытанні размова ішла, і пра сельсаветы, і пра работу дэпутатаў у акругах. Усе 9 нашых сельсаветаў выпісвалі «Звязду». Я і цяпер гэтую ўкладку ўважліва вывучаю. І новых аўтараў для сябе адзначаю. Падабаюцца, напрыклад, матэрыялы Надзеі Дрындрожык.

### АД СУРВЭТКІ ДА МІКРАХВАЛЁЎКІ

— Люблю сваю «Звязду», і яна мяне любіць, — усміхаецца Зоя Іванаўна і ўспамінае свой першы выйгрыш. — Паслала купон і праз нейкі час атрымала вялікі канверт, у якім былі льняная сурвэтка і зборнік прыпевак. З тых часоў шлю купоны і выйграю. Раней шчасціла раз гады ў тры, цяпер часцей. Усе вакол здзіўляюцца, што гэта за газета такая шчодрая. І падбухторваюць. Маўляў, у рэдакцыі ўжо калі бачаць маё імя, адразу ж прыз даюць.

Гадоў дзесяць таму падпісчыца выйграла трохразжковую жырандолю, якая і сёння ўпрыгожвае яе спальню. Потым пашчасціла выйграць прас, таксама спраўна служыць. Сем гадоў таму атрымала ў падарунак гамак, на якім дзеці і ўнукі дагэтуль гушкаюцца. Чарговы прыз — мікрахвалёўку — падарыла на імяніны ўнуку. Не лішнім быў у гаспадарцы і блэндар. А ў канцы мінулага года яна выйграла абагравальнік. Зіма была не вельмі халодная, і прыз пакуль стаіць ва ўпакоўцы. Але ў тым, што гэта рэч надзейная, як і ўсе астатнія, не сумняваецца.

— На жаль, ніводнага разу не выйгравала суперпрыз, — перажывае яна. — Так што ў мяне яшчэ застаўся спартыўны інтарэс. Гэтым разам разыгрываецца садовая мэбля. Самае тое, што мне трэба.

Дарэчы, у Клічаўскім раёне шчасціла не толькі Зоі Самец. Чытачка з вёскі Коўбча выйграла тэлевізар. І прадстаўнікі рэдакцыі прыязджалі ў раён яе павіншаваць.

— Тады я і пазнаёмілася з любімым маім аўтарам Валянцінай Доўнар, — расказвае чытачка. — Для «звяздоўцаў» была арганізавана сустрэча з насельніцтвам у райвыканкаме. Журналісты расказвалі пра газету, паказвалі, што яна з сябе ўяўляе, а потым паехалі ўручаць прыз Ларысе Дзенісевіч. Яна ж нават стол накрыла. Пасля той сустрэчы я яшчэ больш палюбіла газету. Супрацоўнікі паказаліся мне вялікімі прафесіяналамі.

На пошце ўжо ведаюць, што, калі Зоя Самец забыла аформіць падпіску на «Звязду», гэта яшчэ не значыць, што яна ад яе адмовілася. Аднойчы ў яе грошай хапіла падпісацца толькі на адзін месяц. Вырашыла, што потым падоўжыць падпіску. А калі ёй перастала прыходзіць «Звязда», пабегла абураная на пошту. Толькі там успомніла, што сама вінаватая. Але ўсё роўна настаяла, каб выпісалі, хоць ужо падпіска і скончылася. Не ўяўляла, як гэта можна жыць без «Звязды».

### РЭПЕРТУАР ПАДКАЗАЛА ГАЗЕТА

Зоя Іванаўна — чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі. Прызнаецца, што хоць і пенсіянерка, але яшчэ і дня на пенсіі не была. З 2010 года працуе ў раённым Савеце ветэранаў адказным сакратаром. А яшчэ яна салістка народнага ансамбля ветэранаў «Крыніца», які ўжо 17 гадоў існуе ў Клічаве. На сцяне кабінета райсавета ветэранаў цэлая выстаўка з дыпломаў і падзяк гэтаму калектыву.

— Усё пачалося з таго, што мы, аматары песні, пачалі ездзіць па аддаленых вёсках, спяваць для жыхароў, — расказвае падпісчыца. — Колькі душэўнасці было ў тых канцэртах — словамі не перадаць. Нам дарылі букеты з рамонкаў і півоняў са сваіх клумбаў. І не было ўзнагароды даражэйшай, чым гэтыя кветкі. Выступалі каля жылых дамоў, на фермах, у полі. Спявалі спачатку ўсё запар, затым перайшлі на беларускамоўныя песні. І тут нам зноў дапамагла «Звязда». Песні, якія там друкаваліся, сталі часткай нашага рэпертуару. А ён у нас вельмі багаты — амаль 200 песень. Мы сваёй творчасцю прапагандуем беларускую песенную спадчыну. Акапэльна спяваем народныя песні.

У маёй суразмоўніцы ад прабабулі засталося шмат ручнікоў, абрус, нават саматканае з вышыўкай адзенне — андарак, кашуля, фартух, намітка. Гэты касцюм яна адзявае, калі трэба прадэманстраваць той ці іншы мясцовы абрад. Калектыў адрадзіў два — «Каляда на дуба» і «Пакровы». Двойчы ансамбль здымала сталічнае і абласное тэлебачанне. У вёсцы Вастраў праходзілі здымкі абраду «Пакровы», дзе Зоя Самец выступала ў ролі гаспадыні. Яна яшчэ памятае, як у яе вёсцы адзначалі гэта свята. Быў вялікі кірмаш, забівалі парсючка, прыязджалі госці і тры дні гулялі па поўнай праграме. Удзел у здымках абраду, акрамя «Крыніцы», прымалі яшчэ два калектывы. Рукадзельнічалі, песні спявалі, расказвалі пра жыццё. А яшчэ Зою Самец запрашалі зняцца ў фільме пра паходжанне назвы горада Клічава. Здымкі адбываліся ў раённым музеі. Зоя Іванаўна выступала ў ролі служанкі былога ўладара тутэйшых мясцін пана Незабытоўскага.

Сёлета аддзел культуры Клічаўскага райвыканкама арганізаваў у парку райцэнтра канцэрт выхаднога дня «Лета маё залатое». І Зоя Іванаўна разам са сваімі таварышамі па калектыве працягвае несці культуру ў масы. На канцэрце «Крыніцы» было шмат цікавых момантаў. Напрыклад, майстар-клас па народных танцах — кракавяк, падэспань і арэхаўская полька. Калісьці яны былі папулярнымі ў гэтай мясцовасці, але амаль забыліся. Прыйшоў час іх вяртаць. Каб нябачная сувязь паміж мінулым і цяперашнім не перарывалася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*г. Клічаў.*

# «МОЙ АДРАС — РОДНАЯ ГАЗЕТА»

## Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір БАРАДЗІН жыве на праспекце газеты «Звязда»

**Імя найстарэйшага перыядычнага выдання краіны адзін са сталічных праспектаў носіць з 16 чэрвеня 2005 года. Менавіта ў гэты дзень па ініцыятыве народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна рашэннем Мінгарвыканкама праспект газеты «Известия» быў перайменаваны ў праспект газеты «Звязда». Сімвалічна, што ў доме № 9 (менавіта 9 жніўня 1917 года выйшаў першы нумар «Звязды») жыве ветэран Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір БАРАДЗІН.**

Карэспандэнтам «Звязды», якія завіталі да ўдзельніка ваенных падзей у госці, ён расказаў, што жыве па гэтым адрасе ўжо больш як 20 гадоў. Пераехаў сюды, калі яшчэ праспект насіў імя савецкай газеты. «Навошта нам «Известия», калі ў нас ёсць наша «Звязда»?» — перакананы Уладзімір Васілевіч, заўважыўшы, што з вялікай радасцю ўспрыняў рашэнне аб перайменаванні праспекта.

Ветэран падзяліўся, што ў свой час на вабар кватэры паўплываў развіты транспартны вузел (хоць на аўтобусе, хоць на тралейбусе, а цяпер і на метро — едзь куды табе трэба), а таксама харчовая крама, якая знаходзілася праз дарогу. Цяпер, вядома, месцаў, дзе можна папоўніць харчовы запас, стала яшчэ больш. Дарэчы, па прадукты Уладзімір Васілевіч ходзіць сам. «Навошта мне дапамога, калі я і сам магу!» — здзіўляецца ён, калі я пацікавілася, хто яму дапамагае. А ветэрану, між іншым, у верасні споўніцца 98 гадоў!



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### «УСЁ ЎЗЛЯТАЕ І ПАЧЫНАЕ ГАРЭЦЬ»

Мы сядзім у яго ўтульным пакойчыку, і Уладзімір Барадзін у думках пераносіцца ў сваё дзяцінства, маладыя гады. Нарадзіўся ён у далёкім 1925 годзе ў сяле Салянка Уладзімірскага раёна Сталінградскай вобласці. Калі Уладзіміру Васілевічу было два гады, пераехалі ў Мінск — на месца службы бацькі. У Мінску дыслацыравалася 7-я Самарская дывізія імя Англійскага пралетарыяту, дзе бацька быў намеснікам камандзіра эскадрона, а потым намеснікам начальніка школы малодшых камандзіраў. Маці працавала ў палкавой ашчаднай касе. Па першым часе сына бралі з сабой.

— Дзяваць мяне не было куды, таму ўсюды цягалі за сабой, — згадвае Уладзімір Барадзін. — Прывядуць у казарму, да днявальнага, чырвонаармейцы пацяшаюцца з мяне. Дадуць у рукі вінтоўку-трохлінейку, і я стаю — быццам вартавы. Салдаты ідуць у сталовую і мяне ў страі вядуць. Такое і жыццё было, пакуль не адкрылі дзіцячы сад.

Ветэран успамінае, што да вайны Мінск быў зусім невялікі. «З аднаго боку — піўзавод (ён і цяпер там стаіць), за вакзалам — вёска, — кажа суразмоўца. — Ваенныя могілкі ў раёне вуліцы Берасцянскай, з іншага боку — Камароўскі рынак. За ім было балота і балотная станцыя. Вось і ўвесь тагачасны Мінск. Маленькі быў горад».

У 1938—1939 гадах Васіль Барадзін служыў пад Полацкам. Адпаведна, разам з ім была і яго сям'я. У 1939 годзе ваеннаслужачы ўдзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Будучы на маршы, Васіль Барадзін атрымаў тэлеграму з Масквы, у якой паведамлялася аб яго пераводзе на службу ў Літву, у горад Алітус. Ужо ў Каўнас да бацькі, якога прызначылі камісарам артылерыйскага палка, неўзабаве прыехала і сям'я. За два месяцы да пачатку Вялікай Айчыннай вайны вайсковую часць перавялі ў Шаўляй.

— Мы ўжо збіраліся да яго ехаць, — расказвае Уладзімір Барадзін. — Планавалі спачатку паглядзець кватэру, а потым рэчы перавозіць. Чамаданы ўжо былі гатовыя. У іх — самае лепшае: адрэзы тканіны, мой новенькі касцюм, які я так ні разу і не адзеў...

У Каўнас яны больш не вярнуліся — у Шаўляі іх застала вайна. «Мы спыніліся ў гасцініцы, — згадвае ветэран. — Прыходзіць бацька і кажа, каб браў збан (тады сталі ў кожным нумары) і ішоў па піва. Я выйшаў з гасцініцы, метраў 20—30 прайшоў, гляджу — самалёты ўсё кружаць над цэнтрам горада. Ведаю, што манеўры ідуць Прыбалтыйскай ваеннай акругі, таму так і патрэбна. Потым гляджу: самалёт скідвае бомбы. Усё ўзлятае і пачынае гарэць. Ішоў чалавек у цывільным, я ў яго пытаюся, што там такое. Ён кажа, што на месцы выбуху пошта была. Я рвануў назад у гасцініцу. Бацькі ўжо не было...»

### «Я ПАВІНЕН ІСЦІ НА ФРОНТ!»

Васіль Барадзін, удзельнік стварэння 9-й артылерыйскай супрацьтанкавай брыгады рэзерву галоўнага камандавання, з першых дзён быў на фронце. Па яго сына і жонку, як і па сем'і іншых афіцэраў, прыехала палутарка — застава ў горадзе было небяспечна. Накіраваліся ў бок Дзвінска (сучасны Даўгаўпілс).

— Мала сказаць, што ўсю дарогу нешта берагло, — успамінае тую паездку мой суразмоўца. — Над намі ляцеў нямецкі знішчальнік: яны ж тады шасталі ўсюды. Наперадзе ішоў аўтобус, і ён на брыючым палёце расстраляў увесь аўтобус. А мы следам ішлі... Нам удалося праскочыць.

Па прыбыцці ў Даўгаўпілс людзей пасадзілі ў эшалоны. Наперадзе ішоў эшалон з каштоўнасцямі — у ім везлі грошы з банкаў, іншыя рэчы. Ад нямецкіх знішчальнікаў людзей выратавала тое, што эшалон з каштоўнасцямі знаходзіўся пад асаблівай аховай савецкіх вайскоўцаў — на кожным вагоне сталі кулямёты. За ім ішлі цягнікі з насельніцтвам. Эшалон, у якім ехалі Барадзіны, у адрозненне ад саставу, які ішоў следам, пасляхова дабраўся да Оршы. Маці Уладзіміра планавала, што далей накіруюцца ў бок Мінска — там з сынам жыла яе сястра. Ваенны камендант сказаў ёй, што з беларускай сталіцай сувязь страчана, цягнікі туды ўжо не хадзілі — Мінск ва ўсю бамбілі...

Барадзіным выпісалі дакументы на найбліжэйшы эшалон. Яны нават не ведалі, куды ён ішоў. Прыбылі ў Сталінград. Там Уладзімір уладкаваўся ў школу фабрычна-заводскага навучання, дзе выпрабляліся катушкі для сувязі — яны былі неабходны на фронце. У Мінску, у тэхнічнай школе, Барадзін займаўся канструяваннем, таму добра ведаў, што трэба рабіць. Яго нават прызначылі памочнікам майстра. У падначаленні ў 16-гадовага хлопца знаходзілася 25 чалавек. Потым яго перавялі на аэрадром. Трапіў у цэх, дзе правяралі на спраўнасць кожны вузел самалёта. Паралельна Уладзімір Барадзін працаваў з моладдзю, стварыў камсамольскую арганізацыю.

Потым юнак уладкаваўся на мэблева-скрыначны камбінат, які ў ваенны час выпускаў планеры для дэсантавання. Бывала, што ад стомленасці Уладзімір Васілевіч не мог дайсці дахаты — дапамагалі міліцыянеры, якія дзяжурылі ў горадзе. Пасля працоўных змен мог суткамі спаць. «Часам мы тыднямі не выходзілі з завода, — расказвае ён. — Лічылася, што мы перайшлі на казарменнае становішча. Цяжка было. Адзінае — карміла добра. Кавалак каўбасы, некалькі штучак пячэння, кубікаў цукру і нават масла — гэта быў дадатковы паёк. Я ўвесь гэты паёк збіраў і цягнуў дахаты. Са мной жа маці была. Ёй, акрамя хлеба, на рабоце нічога не давалі».

У Сталінградзе яны з маці перажылі першую бамбёжку. Адзін за адным яго таварышы сыходзілі на фронт. «А мяне ўсё ніяк не прызываюць, — расказвае ўдзельнік вайны. — Тады я пайшоў да ваенкама і кажу: «Што ж вы робіце, я ж усё-такі сакратар камсамольскай арганізацыі, таму ў першую чаргу павінен ісці на фронт. А там то радыстамі, то снайперамі бралі. Адным словам, не атрымалася тады».

Толькі з трэцяй спробы ваенны камісар «здаўся». Нягледзячы на тое, што Уладзіміру Барадзіну не было 18 гадоў, яго ўзялі — запісалі добраахвотнікам, каб менш узнікала пытанняў. Аднак перш чым трапіць на фронт, давялося павучыцца ў Адэскім артылерыйскім вучылішчы, якое знаходзілася ў эвакуацыі пад Ніжнім Тагілам. «Вучыцца было няпроста, — успамінае ён. — Зіма на Урале халодная: пад 40 градусаў марозу! Цёплае адзенне, ватныя штаны і валёнкі давалі толькі тады, калі заняткі на вуліцы праводзіліся звыш чатырох гадзін. Калі да чатырох — шынель і ўсё».

### «ТАКІ ПЛАЧ СТАІЦЬ — ПРОСТА ЖАХ!»

Пасля васьмі месяцаў навучання, восенню 1943 года, Уладзіміра Барадзіна накіравалі на Паўднёва-Заходні фронт, які потым перайменавалі ў 3-ці Украінскі. Асноўныя баі для яго пачаліся на тэрыторыі Украіны і Польшчы. Франтавік вызваляў Адэсу, Варшаву, Познань, фарсіраваў Паўднёвы Буг, Днестр, Заходні Буг, а таксама Віслу і Одэр, дайшоў да Берліна.

Тыя падзеі — дагэтуль у галаве ветэрана. Уладзімір Васілевіч да драбніц памятае многія эпізоды найбольш складанага перыяду ў сваім жыцці. І тое, як з таварышам Барысам Пячоным зайшлі на міннае поле і ледзь выбраліся. І тое, як у цэмры па гразі пракладваў шлях тягачам, якія цягнулі гарматы. І тое, як еў горкі хлеб. І тое, як аплаквалі сваіх родных уцалелыя жыхары Новай Адэсы...

— Заехалі ў гэты горад, а там такі плач стаіць — проста жах! — не можа забыць Уладзімір Барадзін. — Аказалася, што немцы, адступаючы, забіралі з сабой людзей. Многія пахаваліся ў штольнях (збудаваннях з горных парод. — **«Зв»**.). Сунуліся немцы ў першую штольню — людзі пачалі ў іх страляць. Немцы павярнулі назад. З другой штольні ўсіх (там былі і старыя, і дзеці, і жанчыны) павыцягвалі і расстралялі. У роў скінулі, закапалі ды яшчэ і танкам праехалі. Калі мы ўвайшлі ў горад, роў ужо быў раскапаны, сталі труны — тыя, хто выжыў, хавалі сваіх сваякоў.

У памяці — і першая на фронце сустрэча з бацькам. Гэта было ў 1944 годзе, за Адэсай. «Абняліся, абмяняліся некалькімі словамі, — згадвае Уладзімір Васілевіч. — Бацька мне сказаў, каб я трымаўся, годна выконваў пастаўленыя задачы, і паехаў». Другая сустрэча бацькі і сына адбылася ўжо ў Берліне.

### «ДА ЛОГАВА ФАШЫСЦКАГА ЗВЕРА — НА БЕРЛІН!»

Уладзімір Барадзін з'яўляўся камандзірам узвода 43-й гвардзейскай армейскай гарматна-артылерыйскай Запарожска-Адэскай ордэна Леніна, Чырванасцяжнай, ордэнаў Суворава і Кутузава брыгады. Пры гэтым ён быў самым маладым — як ён сам кажа, хлапчанём у параўнанні з дарослымі мужчынамі. Але на ўзрост на фронце ніхто не глядзеў: хто старэйшы па званні — да таго і прыслухоўваюцца.

Жорсткія баі, успамінае суразмоўца, былі пад Ковелем. Там іх брыгада рыхтавалася да наступлення. Ветэран памятае і тое, як фарсіравалі Заходні Буг, вызвалялі польскія гарады Хэлм і Люблін.

— Пасля адной такой вогненнай вакханаліі мы пайшлі ў горад — трэба ж паглядзець, па чым мы лупілі з гармат, — кажа ветэран і ўдакладняе, што рэдка такое было. — Мне толькі адзін раз за ўсю вайну ўдалося паглядзець тую батарэю, па якой я страляў. Адна гармата была пашкоджана, другая таксама, дзве яны сцягнулі ўсё-такі. Зайшоў у пакой камендатнта. Трафеяў я не браў ніякіх. Але ў яго ляжалі на стале каляровыя алоўкі — гэта артылерысту трэба. Дагэтуль іх захоўваю.

Затым франтавік фарсіраваў Віслу. «Нашу батарэю паставілі акурат на беразе, — згадвае Уладзімір Барадзін. — Паступіла каманда — расчысціць супрацьлеглы бераг. Добранька апрацавалі. Плацдарм быў захоплены. З яго пачалося наступленне на Варшаву. Баі там былі моцныя. Затым не затрымліваліся каля гарадоў. Калі было неабходна, пакідалі пэўную воінскую часць. Астатнія рухаліся наперад, да логава фашысцкага звера — на Берлін!»

Аднак на шляху савецкіх салдат была перашкода — рака Одэр. Фарсіраваць яе было няпроста: гітлераўцы ўсё рабілі для таго, каб не пусціць чырвонаармейцаў на іх зямлю. З абодвух бакоў — вялікія страты.

На адной з агнявых пазіцый Уладзімір Барадзін страціў сем чалавек са свайго падраздзялення. Сам цудам застаўся жывы. Уладзімір Васілевіч лічыць, што яго выратаваў акардэон, які ён пакінуў каля акопа. «Тут выбух, там выбух: думаю, акардэон сапсуецца, — пераносіцца ў тое імгненне суразмоўца. — Скачу ў акоп, бяру акардэон, стаўлю ўніз — літаральна за некалькі метраў ад мяне ўзрываецца снарад...»

З тым акардэонам Уладзімір Барадзін і сустрэў Перамогу, пасля прывёз яго ў Мінск. Але перш давялося пахаваць сваіх баявых таварышаў. За жыццё аднаго з іх змагаліся медыкі, але дарэмна... Да гэтага загінулы таварыш служыў у пяхоце: сем разоў быў паранены, столькі ж — прадстаўлены да ўзнагароды, але ні адной так і не атрымаў. Салдату параілі ісці служыць у артылерыю: маўляў, застанешся жывы. Але выйшла ўсё наадварот. Пасля вайны Уладзімір Васілевіч адшукаў адрас свайго саслужыўца, напісаў родным, як загінуў іх муж і бацька. Адказ, які ён атрымаў, ашаламіў. Яму напісалі, што дзеці не памятаюць загінулага, што жонка хворая і папрасілі больш не турбаваць.

### «ПЕРАМОГА! ПЕРАМОГА!..»

Апошні артылерыйскі залп падраздзялення, якім камандаваў лейтэнант Барадзін, дало 2 мая. На другі дзень пасля гэтага да яго прыехаў бацька, прывёз сыну вялікі канцэртны акардэон. Глава сям'і ехаў ваяваць на Далёкі Усход.

— Ці распісаліся на Рэйхстагу? — цікаўлюся ў ветэрана.

— Вядома! Гэта быў трэці ці чацвёрты дзень пасля яго ўзяцця, — згадвае ўдзельнік тых падзей. — Паставілі гарматы, трактары на аэрадроме і на грузавіках «Студэбекер» паехалі да Рэйхстага. Уласна кажучы, там не было ўжо месца, дзе і размахвацца. Я ледзьледзь тры літары свае *(БВВ)* надрапаў. Там усе так рабілі. У асноўным, ніз увесь быў распісаны. Наверх жа не залезеш.

Уладзімір Васілевіч прызнаецца: яго ў будынку Рэйхстага здзівіла тое, што там стаяў куфар з узнагародамі (жалезнымі крыжамі). «Ніхто іх нават браць не хацеў, — удакладняе ён. — Потым вырашылі наверх забрацца. Лесвіца, якая вяла туды, была разбітая. Я здзіўляюся, як гэта нашы хлопцы (чырвонаармейцы, якія ўзнялі Сцяг Перамогі над Рэйхстагам. — **«Зв»**.) туды прабраліся....»

Перамогу Уладзімір Барадзін сустрэў у невялікім сяле, дзе спыніліся па дарозе ад Берліна да месца пастаяннай дыслакацыі. Акурат ішлі з саслужыўцамі глядзець, дзе можна застацца на начлег. «Раптам чую залп: думаю, зноў дзесьці немцы вылезлі, — успамінае ён дзень 9 мая 1945 года. — Мы як рванулі... Прыбягаем у падраздзяленне, а там наперадзе гармат — пажар. Мы таксама прыклалі руку да гэтай справы: некалькі ж залпаў далі. Усе крычалі «Перамога! Перамога! Перамога!» Паставілі сталы (пазбіралі з хат), дзе крэслы, дзе дошкі паклалі замест крэслаў — быў абед. І ў абавязковым парадку — наркамаўскія сто грамаў. Так мы сустрэлі Перамогу».

Пасля вайны Уладзімір Барадзін застаўся ў арміі. Да 1948 года служыў у Германіі — у групе савецкіх войскаў. Затым уся яго служба праходзіла ва Украіне. Званне палкоўніка атрымліваў ужо ў Мінску, дзе і застаўся. Найлепшага горада, па словах ветэрана, няма. «Які Мінск быў, а які стаў! Столькі зроблена!» — кажа Уладзімір Васілевіч.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, на кіцелі якога зіхацяць ордэн Чырвонай Зоркі і тры ордэны Айчыннай вайны II ступені, медалі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Варшавы», не можа змірыцца з тым, што зноў у свеце ўзнялі галаву фашызм. «Я калі там служыў, гэты беспарадак ужо быў, — кажучы пра Украіну, адзначае ветэран. — Мая рота знаходзілася недалёка ад Львова. У суседняе сяло па начах з горада прыходзілі бандэраўцы. Яны і палілі, і забівалі, і ў балота людзей кідалі. У лясах іх было колькі хочаце. На двух палігонах гэтыя банды трэніраваліся ў стральбе. У той час! Таму не дзіўна, што цяпер адбываецца на Украіне. Нам галоўнае — не дапусціць падобнага на беларускай зямлі!»

Менавіта такі запавет ад аднаго з апошніх удзельнікаў той вайны. Варта прыслухацца.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «ТУЮ СУСТРЭЧУ З ФОТАКАРЭСПАНДЭНТАМ «ЗВЯЗДЫ» І СЁННЯ ПАМЯТАЮ»

**Старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ прыгадаў сваё асабістае знаёмства з нашым выданнем:**

— Я ведаў пра газету яшчэ са школьных гадоў, бо мой дзядзька заўсёды выпісваў «Звязду», і толькі гэту газету. Дзядзька жыў з бабуляй у Ашмянскім раёне, і я часта прыязджаў да іх з суседняга Смаргонскага, дзе жыў з бацькамі. Назва выдання тады адклалася ў маёй свядомасці. А калі прыйшоў з арміі, адбылася тая самая першая сустрэча з фотакарэспандэнтам.

Быў якраз летні сезон, работы ў вёсцы хапала, вось і мне давялося ў гэты працэс уключыцца. У бацькоў была хатняя гаспадарка, і я ім дапамагаў. Вось так аднойчы вяртаюся на ровары з сенакосу, травы накасіў, вязу ў мяшку. А насустрач ідзе чалавек з фотаапаратам, відавочна, што прафесійны фатограф, так і аказалася. Ён спыніў мяне, сказаў, што працуе ў газеце «Звязда», распытаў, хто я, што раблю. Я расказаў, што нядаўна вярнуўся з арміі, працую ў школе настаўнікам і зараз дапамагаю бацькам па гаспадарцы. Мы крыху паразмаўлялі, ён зрабіў мой здымак, які потым выйшаў на першай паласе. Тады я даведаўся, што фотакарэспандэнта завуць Анатоль Кляшчук.

Пасля многія людзі мне нагадвалі, што бачылі фота ў газеце. Але найбольш здымак узрушыў маіх вучняў. Газету выпісвалі ў многіх сем'ях, і тое фота мае вучні выразалі і заклалі пад такую празрыстую вокладку ў падручніках біялогіі, бо я вёў гэты прадмет. Калі прыйшоў 1 верасня ў школу, яшчэ амаль увесь год заўважаў сваё фота праз гэтыя вокладкі. Было прыемна, што дзеці такім чынам выказваюць свае адносіны да настаўніка. Цяпер з усмешкай пра гэта ўспамінаю...

**— За гэты даволі працяглы перыяд часу, вядома, многае ў вашым жыцці змянілася. Вы ўжо кіраўнік раёна. А якімі сталі вашы адносіны да «Звязды»? І чаму?**

— Вядома, адносіны да газеты засталіся толькі пазітыўныя. У выданні ёсць свой традыцыйны падпісчык, свой чытач. Мне вельмі імпануе, што газета выдаецца на беларускай мове, і гэта вельмі станоўча вылучае яе сярод іншых перыядычных выданняў. Гэтым яна, што называецца, «трымае» чытача.

Важна, што газета разам з актуальнымі агульнарэспубліканскімі падзеямі не забываецца і пра нашу «глыбінку», пра простых людзей. Мне, як чалавеку вясковаму, прыемна чытаць такія артыкулы.

Аб папулярнасці выдання сведчыць і той факт, што газеце ўжо больш за сто гадоў. Чаму ў сучаснай шматмедыйнай прасторы «Звязда» змагла захаваць сваю значнасць? Тут я бы хацеў правесці такую паралель. Вось, напрыклад, прыходзіць кіраўнік, недзе «бліснуў» і знік. А калі чалавек адказна выконвае свае абавязкі, адчувае сувязь з паплечнікамі, выбудоўвае адносіны з людзьмі — яго надоўга хапае. Так і газета будуе адносіны з чытачом — на трывалай аснове. Колькі было такіх выданняў, якія толькі з'явіліся, нейкі час трымаліся за кошт нейкіх «смажаных» фактаў, а потым зніклі з інфармацыйнага поля. А «Звязда» столькі гадоў трымаецца на плыву, значыць, яе кантэнт задавальняе чытачоў, яе паважаюць. Мабыць, таму яна і адрозніваецца такім даўгалеццем.

**— Хацелася б даведацца, карыстаючыся момантам, якія цяпер важныя клопаты ў кіраўніка Свіслацкага раёна? Чым бы вы хацелі падзяліцца на старонках газеты?**

— Ведаеце, сёння многа абмяркоўваецца сітуацыя з санкцыямі. Маўляў, гэта прывядзе да калапсу. Як бачым, гэтага не адбылося. Беларусь як развівалася, так і развіваецца. Важна паказаць, што мы не засталіся ў ізаляцыі, у нас ёсць надзейны партнёр — Расійская Федэрацыя. У нашы тэрыторыі ўкладваюцца не толькі беларускія, але і замежныя інвестыцыі. У Свіслацкім раёне, напрыклад, у канцы гэтага альбо на пачатку будучага года ўступіць у дзеянне буйны лагістычны цэнтр. Праз некалькі месяцаў будзе завершаны значны праект па дрэваперапрацоўцы з замежным капіталам. Вельмі важна адлюстроўваць такія дасягненні на старонках газет, даносіць пазітыўныя навіны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**




**Такі вось юбілейны торт спяклі для «Звязды» майстры сталічнага хлебазавода № 2.**

З нагоды

# «...Бо выйшла столькі нумароў,

## Дзе кожны — праўда — залаты!»

**«Звязду» мы сталі выпісваць яшчэ ў далёкім 1961 годзе, калі я вярнуўся з войска, прычым камуністам. Цяпер, дарэчы, «крыюць» іх, нібы нейкіх ворагаў, а тады ў партыю прымалі найлепшых, і ўжо яны ў абавязковым парадку павінны былі выпісваць саюзную «Праўду» і рэспубліканскую «Звязду».**

А сапраўднае супрацоўніцтва з ёй пачалося з народнага фальклору. Ён, мусіць, у крыві ў мяне быў?

У галодныя пасляваенныя гады ўдовы ды дзеці на работу ў калгас, за якую амаль не плацілі, выходзілі з песнямі. Па суботах і нядзелях ладзіліся вячоркі (для дарослых асобна, для падшыванцаў асобна), і збіраліся на іх усе і са сваёй, і з суседніх вёсак, збіраліся галодныя ў ацалелых ад вайны халодных хатках... Танцавалі, пелі прыпеўкі, бралі ўдзел у народных святах і абрадах, гулялі ў хованкі ды іншыя гульні...

Уручную касілі, уручную жалі, аралі-баранавалі конямі — выконвалі любую — на сённяшні розум, дык проста непасільную — работу... Стамляліся, але ж як было весела!

«Звязда», як, мусіць, ніякая іншая газета, звязаная з народам. Найперш — сваёй моваю, сваёй блізкасцю да людзей, сваім уменнем выслухаць іх — даць слова.

Разумею, якая радасць у тых, хто бачыць, што яго допісы, вершы, думкі з'яўляюцца на старонках, бо гэта ж — на ўсю краіну!

А як жа цікава па пятніцах чытаць праўдзівыя (ці, можа, і не зусім?!) гісторыі! Як прыемна адчуваць, колькі ж талентаў сярод звяздоўскіх чытачоў!

Помню, як адзін падпісчыкаў папракаў газету за тое, што надрукавалі здымак, да якога ну ніхто не зможа прыдумаць подпіс!

Народ змог! І гэтых подпісаў — кароткіх, трапных, смешных — з'явіўся россып, на цэлую газетную старонку! «Звязда» тады выказала ўпэўненасць, што, калі б змясціла кропачку і больш нічога, чытачы ўсё роўна не спасавалі б: нават у гэтым выпадку змаглі б паказаць свае здольнасці!

...Што ж пажадаць такой газеце ў сувязі з выхадам трыццацітысячнага нумара?

Быць з народам, служыць яму, як бы ні было гэта цяжка!

Што да нас, чытачоў, то

*Мы са «Звяздой»*
*заўжды жывём*
*І задаволеныя тым,*
*Што выйшла столькі нумароў,*
*Дзе кожны — і праўда — залаты!*

*І надалей мы будзем жыць,*
*З табой, «Звязда»,*
*знаходзіць згоду.*
*Бо вечна ты будзеш служыць*
*Сваёй зямлі, свайму народу!*

**Іван Астроўскі,**
*г. Мінск.*

# Рэдакцыі газеты «Звязда» з нагоды яе 30 000 нумара

Найстарэйшая «Звязда» выхавала не адно пакаленне патрыётаў і шчырых дбайнікаў на беларускай ніве. Яе чыталі мае амаль непісьменныя бацькі з вёскі Баяры, што на Нясвіжчыне. Чыталі і дзяліліся ўражаннямі іхнія шматлікія суседзі. Праз усё жыццё не выпускаў з рук «Звязду» з «Чырвонай зменай» і я. І не перастану чытаць, пакуль дадзена мне быць на гэтым свеце. Бо цікава. Бо карысна. Бо патрэбна. І добра, што ўсё гэта ўмелі і рабілі яе ранейшыя супрацоўнікі. Дзякуй, што гэтак жа ўмела і дбайна шчыруюць над кожным нумарам сённяшнія. Ну а мы, чытачы, давайце не пакідаць нашу любімую газету адзін на адзін з пакручастым лёсам. Бо яна — наша. Бо гэта — родная газета на роднай мове. Была, ёсць і будзе.

**Анатоль Бутэвіч,**
**былы намеснік рэдактара «Чырвонай змены» і нязменны чытач «Звязды».**

# Віншаванне з канверта

*«Звязда» ў доме —*
*для парадку:*
*Мазгам маім дае зарадку:*
*То подпіс трэба ў «Хто каго?»,*
*То ўспамін з жыцця майго,*
*То людцам добрым*
*на забаўку*
*Дашлю на «провад»*
*сваю байку...*
*Адно...*
*рэдактар — крытык строгі:*
*Ён пазбівае часам рогі:*
*Знойдзе хібы тут ды там*
*І...*
*заданне зноў мазгам,*
*Каб хаця не заржавелі!*
*Каб круціліся, яснелі,*
*Прымушалі не здавацца*
*І з хваробамі змагацца!*

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

***

*Я — дзед*
*з кагорты адналюбаў:*
*Даўным-даўно*
*«Звязда» мне люба.*
*Ёй здраджу —*
*як пакіну свет...*
*Ну а яна —*
*няхай жыве:*
*Святлом хай грэе ў жытле*
*І мудраю дарадцаю*
*Хай думкі нам парадкуе!*

**М. Дзядок,**
*г. Мінск.*

# «Эстафету падхапілі іншыя»

**...Атрымаўшы свежы нумар газеты, я, напрыклад, не звяртаў увагі на лічбы пад назвай, і, як высвятляецца, дарэмна, бо трыццаць тысяч — гэта ж гучыць! Гэта ж падстава для гонару ці нават зайздрасці!**

Калі я служыў у войску (тады — у Савецкай Арміі), нашы нампаліты выпісвалі выданні тых рэспублік, адкуль у падраздзяленні большасць салдат.

Дык вось на стале ў нашым так званым чырвоным кутку заўсёды ляжала падшыўка «Звязды», і заўсёды нехта з салдат гартаў яе, нешта чытаў, выпісваў і, бярусь сцвярджаць, дзякуючы мове, вяртаўся дамоў, у сваю сям'ю, у родную вёску ці горад. «Звязда» была прывітаннем з Радзімы, яе гаючым паветрам. Гэта праўда: «Каб любіць Беларусь маю мілую, трэба ў розных краях пабываць!»

Вярнуўшыся дамоў, я стаў пастаянным чытачом і падпісчыкам газеты, а потым, дзякуючы ўсенародна любімым рубрыкам «Алё, народ на провадзе!» і «Хто каго?» — аўтарам, пазаштатным карэспандэнтам: дасылаю свае праўдзівыя гісторыі, вершы, нават артыкулы і ганаруся тым, што газета друкуе іх, што вучыцца больш адказна ставіцца да роднага слова.

Радуе і тое, што яно, самабытнае, жыве на старонках газеты!

...У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны можна ўбачыць звяздоўскія нумары, надрукаваныя ў падполлі. Іх чатыры, і за іх паплаціліся жыццямі рэдактар газеты Уладзімір Амельянюк, яго памочнікі. Эстафету падхапілі іншыя...

Я схіляю галаву перад памяццю ўсіх былых супрацоўнікаў «Звязды».

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

# «Яна сама ўнікальны феномен гісторыі»

### Пра што пісалі ў юбілейных нумарах і як віншавалі газету вядомыя асобы

**Сёння вы трымаеце ў руках 30-тысячны нумар «Звязды». Юбілейныя нумары нашай газеты выходзілі і раней — і прыпадалі на розныя часы ў гісторыі — пераважна савецкага часу. Індустрыялізацыя і калектывізацыя пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя, узмацненне халоднай вайны ў пачатку 50-х, завяршэнне хрушчоўскай «адлігі» і пачатак эпохі застою — усе гэтыя падзеі знаходзілі адлюстраванне на старонках газеты і мянялі саму «Звязду». Але нязменным заставалася павага да «сілы друку» як з боку кіраўніцтва краіны, так і выбітных дзеячаў, у тым ліку знакамітых пісьменнікаў і сённяшніх класікаў літаратуры. Мы паглядзелі і ўспомнілі, якімі былі папярэднія юбілейныя нумары нашай газеты.**

## Ад Кнорына да Чорнага і Лынькова

Першы значны — 5-тысячны — юбілейны нумар выйшаў 30 ліпеня 1934 года. І амаль увесь прысвечаны гэтай значнай падзеі. Можна не пераказваць перадавіцу «Быць заўсёды на баявым пасту» і дэкларацыю «Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало «Звязда» і надалей будзе нястомна змагацца за справу Леніна-Сталіна», іх красамоўных назваў дастаткова, каб зразумець агульны сэнс.

Абавязковымі ў такіх святочных выпадках былі і прывітанні кіруючых органаў: Савета народных камісараў, старшыні ЦВК СССР і БССР А. Чарвякова. Сярод іх і прывітанне на той час дырэктара Гісторыка-партыйнага інстытута чырвонай прафесуры, супрацоўніка Камінтэрна таварыша **Кнорына**. Яно не выпадковае — у 1917 годзе будучы партыйны і дзяржаўны дзеяч, кіраўнік інфармацыйна-прапагандысцкага аддзела Камінтэрна Вільгельм Кнорын быў адным з першых рэдактараў «Звязды». *«Жадаю ў далейшым паспяхова змагацца за лінію партыі, за сацыялізм, заваяваць уплыў у Заходняй Беларусі, пашырыць уплыў у савецкай Беларусі. Няхай жыве бальшавіцкая «Звязда»* — пажаданне будучага галоўнага ідэолага краіны Саветаў цалкам адпавядае характару эпохі.

Павіншавалі «Звязду» і вядомыя беларускія пісьменнікі і паэты. Што значыла газета для тагачаснага пісьменніка, патлумачыў у віншавальным адрасе **Кузьма Чорны**. *«Супрацоўнічаць у «Звяздзе» гэта для пісьменніка значыць хутчэй, як дзе б там ні было, дайсці да самых шырокіх мас сваіх чытачоў. Адсюль вынікае вельмі важны момант для савецкага пісьменніка: цясней быць у сваёй працы звязаным з «Звяздой». Супрацоўнічаць з «Звяздой» павінна быць для пісьменніка гонарам. Прынамсі, мне гэтае пачуццё вельмі знаёмае».*




Падтрымлівае яго і будучы народны пісьменнік БССР **Міхась Лынькоў**. Ён згадвае свае супрацоўніцтва з рэдакцыямі газет (пісьменнік дэбютаваў вершам у смаленскай газеце «Борьба» ў 1919 годзе, а яго першыя апавяданні былі надрукаваны ў 1926-м у бабруйскай газеце «Камуніст») і піша, што *«юбілей «Звязды» я адчуваю як сваё асабістае, кроўнае свята»*.

Адзначым, што віншаванні знакамітых пісьменнікаў суседнічаюць на старонках таго юбілейнага нумара з пісьмамі работнікаў вёскі і прамысловасці «Чаго мы чакаем ад «Звязды», «Як мы апраўдваем імя «Звязды», «Слова ўдарнікам сацыялістычных палёў», «Дамо тавары найлепшай якасці», «Атрымаў я ад газеты шмат». Адметна, што знайшлося на старонках месца і для крытыкі недахопаў у народнай гаспадарцы. У рубрыцы «Усебеларускі рэйд гатоўнасці пунктаў да прыёму зярна» размешчаны артыкул пад назвай «Склады ў Лоеве і Касцюковічах заражаны кляшчом».

**Пятро Глебка** прысвяціў верш з нагоды выхаду 5-тысячнага нумара. Ён так і называецца — «Звязда». Верш-пажаданне з нагоды напісаў і **Янка Купала**.

## Халодная вайна і Якуб Колас — за трыумф ідэі міру

Наступны юбілейны, 10-тысячны, нумар выйшаў ужо ў іншую пару — у 1952 годзе. Скончылася Другая сусветная вайна і пачалася іншая — халодная. Супрацьстаянне паміж дзвюма звышдзяржавамі — СССР і ЗША — толькі нарастала. Таму галоўныя месцы першай паласы адведзены «Адказам тав. Сталіна І. В. на пытанні дыпламатычнага карэспандэнта «Нью-Йорк тайм Джэймса Рэстана». Першае з іх прысвечана самай актуальнай тэме таго часу: ці прытрымліваецца яшчэ савецкі кіраўнік свайго ранейшага пераканання, што вайны паміж СССР і ЗША можна пазбегнуць. *«Я прадаўжаю верыць, што вайну паміж Злучанымі Штатамі Амерыкі і Савецкім Саюзам нельга лічыць непазбежнай, што нашы краіны і надалей могуць жыць у міры»*, — адказаў Іосіф Сталін.

А вось пад адказамі кіраўніка СССР размешчаны два віншавальныя адрасы з нагоды юбілейнага нумара. Першы, вядома ж, ад Цэнтральнага камітэта камуністычнай партыі Беларусі. Віншаванне таксама цалкам адпавядае духу часу. Падкрэсліваецца, што на працягу 35 гадоў газета з'яўляецца *«актыўным баявым памочнікам камуністаў»*, а сярод пажаданняў — *«шырока прапагандаваць геніяльны твор таварыша Сталіна «Эканамічныя праблемы сацыялізма ў СССР» і сілай камуністычнага слова ўзнімаць працоўных на новыя і новыя гераічныя подзвігі»*.

*«Выхоўваць працоўных у духу жыватворнага савецкага патрыятызма, натхняць іх на самаадданую працу ў імя таржаства камунізма»* пажадала і рэдакцыя «Праўды» — галоўнай газеты КПСС і самае ўплывовае выданне ў СССР.

Таксама ў 10-тысячным нумары друкуецца артыкул «Гістарычны шлях «Звязды», дзе падводзяцца вынікі работы газеты, называюць яе недахопы (*«друк прадаўжае часамі скальзіць па паверхні, ён яшчэ не навучыўся перайсці ад асобных крытычных заўваг да больш глыбокай крытыкі»*) і абяцанні ўсё выправіць.

Тут жа ўспаміны аднаго з першых рэдактараў **Аляксандра Фёдаравіча Мяснікова** аб тым, як усё пачыналася: *«Не было грашовых сродкаў. Сабраўшы апошнія капейкі, снарадзілі аднаго з таварышаў у Піцер, у Цэнтральны Камітэт, з чалабітнай: даць нам некаторую суму грошай для пачатку задуманага літаратурнага прадпрыемства. Спадзяваліся і разам з тым думалі, што наўрад Цэнтральны Камітэт прыме пад увагу просьбу маладой, невядомай арганізацыі. Пасланец вярнуўся з двума тысячамі рублёў. Была ж радасць на нашай вуліцы: на гэтыя грошы мы маглі мець шэсць цэлых нумароў сваёй штодзённай газеты»*. Пасля гэтага і выйшаў першы нумар «Звязды», адбылося гэта 27 ліпеня 1917 года (9 жніўня па новым стылі).

І зноў жа сярод пісьмаў чытачоў (некаторыя згадвалі, што чытаюць газету з 1917 года, а хтосьці нават працаваў яе першым наборшчыкам у той час) віншаванне народнага паэта **Якуба Коласа**. *«Сардэчна віншую рэдакцыю «Звязды» і яе аўтарскі актыў з выхадам 10-тысячнага нумара. Мне прыемна адзначыць, што на працягу сваёй дзейнасці газета не адступала ад прынцыпу: друк — магутная зброя нашай слаўнай партыі Леніна—Сталіна»*. Сярод пажаданняў класіка — *«весці барацьбу за яркае асвятленне фактаў і з'яў нашага жыцця, за прынцыповую крытыку і самакрытыку, за трыумф ідэі міру паміж народамі ўсяго СССР»*.



ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ

Сардэчна віншую рэдакцыю «Звязды» і яе аўтарскі актыў з выхадам 10-тысячнага нумара. Мне прыемна адзначыць, што на працягу сваёй дзейнасці газета не адступала ад прынцыпу: друк — магутная зброя нашай слаўнай партыі Леніна — Сталіна.

**Жадаю рэдакцыі і яе супрацоўнікам і ў далейшым актыўна весці барацьбу за ажыццяўленне вялікіх прынцыпаў Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, за пабудову камуністычнага грамадства, за пераўтварэнне прыроды, за павышэнне ўраджайнасці сацыялістычных палёў, за яркае асвятленне фактаў і з'яў нашага жыцця, за прынцыповую крытыку і самакрытыку, за трыумф ідэі міру паміж народамі ўсяго свету.**

Якуб КОЛАС.

## Іван Шамякін і рэдактар, які тэлефанаваў Хрушчову

1 мая 1969 года выйшаў яшчэ адзін юбілейны, 15-тысячны, нумар «Звязды». Як вядома, свята працы было адным з галоўных у савецкай краіне. Яно і стала дамінантным на старонках газеты. Сярод артыкулаў «Сцягі над зямлёй», «У святочным убранні», «Першамай крочыць па планеце» толькі адна сціплая згадка пра 15-тысячны нумар.

У 1985 годзе галоўнай тэмай юбілейнага, 20-тысячнага, нумара (ён выйшаў 22 лістапада 1985 года) сталі перагаворы кіраўнікоў СССР і ЗША Міхаіла Гарбачова і Рональда Рэйгана — першыя за шэсць гадоў, — і прэс-канферэнцыя з гэтай нагоды савецкага кіраўніка.

Юбілейнаму выпуску газеты прысвечаны пераважна пісьмы чытачоў, дзе рабочыя пішуць, што газета — іх сябар і дарадчык. *«Больш як 25 гадоў супрацоўнічаю з газетай. Калі атрымліваеш ад рэдакцыі пісьмо з просьбай напісаць матэрыял пра добрага чалавека ці падзею з жыцця калектыву, то адчуваеш сябе прадстаўніком газеты ў рабочым асяроддзі»*, — піша сталяр Слонімскай мэблевай фабрыкі М. Мініч.

З юбілейным, 25-тысячным, нумарам, які выйшаў ужо ў гэтым стагоддзі, 17 снежня 2003 года, рэдакцыю павіншаваў тагачасны намеснік прэм'ер-міністра краіны **Уладзімір Дражын**. *«Заснаваная яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя, «Звязда» заўсёды была і застаецца не толькі своеасаблівым летапісцам гісторыі Беларусі і жыцця народа, змагаром за лепшыя ідэалы — яна сама ўнікальны феномен гісторыі, культурны набытак нацыі. Прайшоўшы праз усе складанасці лёсу краіны, праз Вялікую Айчынную вайну, сёння «Звязда» разам з народам будуе суверэнную дзяржаву, аб'ектыўна асвятляе працэсы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця Беларусі»*, — гаворыцца ў віншаванні.

Журналісты «Звязды» звярнуліся і да колішніх рэдактараў і супрацоўнікаў «Звязды» — пагутарылі з былымі галоўнымі рэдактарамі Аркадзем Тоўсцікам, які ўзначальваў газету трыццаць пяць гадоў, і Васілём Пыжковым, які мог патэлефанаваць і паскардзіцца самому Хрушчову, прафесарам факультэта журналістыкі Барысам Стральцовым, які калісьці таксама ў ёй працаваў, партызанам і шматгадовым супрацоўнікам газеты Янкам Казловым.

Свае ўспаміны для юбілейнага нумара аб Пятру Міронавічу Машэраве і развагах аб версіях яго гібелі напісаў для святочнага нумара народны пісьменнік БССР **Іван Пятровіч Шамякін**.

На старонках таго юбілейнага нумара артыкулы і сённяшніх яе аўтараў. А значыць, гісторыя «Звязды» працягваецца — мы, цяперашнія звяздоўцы, пішам яе штодня.

**Алена КРАВЕЦ.**



# УВАГА! ПАСТУПАЕМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

Учреждение образования «ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ П.О. СУХОГО»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2023 ГОДУ

за счет средств республиканского бюджета

**ПЛАН ПРИЕМА ЛИЦ ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ НАУЧНО-ОРИЕНТИРОВАННОГО ОБРАЗОВАНИЯ НА 2023 ГОД**

| Орга-низация-испол-нитель | Организация-заказик/ сторонний заказчик | Шифр специаль-ности | Аспирантура | | | | Докторантура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Всего | Из них по форме обучения | | | Всего | Из них по форме обучения | |
| | | | | Дневная | Заочная | Соиска-тельство | | Дневная | Соиска-тельство |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| ГГТУ им. П.О. Сухого | Организация-исполнитель | 05.02.02 | 3 | 2 | 1 | - | - | - | - |
| | | 05.09.03 | 1 | 1 | - | - | - | - | - |
| | | 05.16.09 | 1 | 1 | - | - | - | - | - |
| | | 25.02.05 | 1 | 1 | - | - | - | - | - |
| | | 05.14.01 | - | - | - | - | 1 | 1 | - |
| | РУП «Производственное объединение «Белоруснефть», Гомельский областной исполнительный комитет | 25.02.05 | 4 | - | 4 | - | - | - | - |
| | ОАО «Гомельский завод литья и нормалей», Минпром | 05.16.09 | 1 | 1 | - | - | - | - | - |
| ИТОГО | | | 11 | 6 | 5 | - | 1 | 1 | - |

Также осуществляется прием в аспирантуру и докторантуру на обучение за счет средств юридических и физических лиц по всем открытым в университете 11-ти специальностям.

**Прием документов с 1 августа по 30 сентября**
**по адресу: г. Гомель, пр-т Октября, 48, кабинет 1-601, тел. 8 (0232) 29 59 18,**
**http://www.gstu.by**

УНП 400073500

Учреждение образования
«Белорусский государственный аграрный технический университет»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ в 2023 году

**по следующим специальностям:**

| СПЕЦИАЛЬНОСТИ | План приема | | |
|---|---|---|---|
| | Форма получения образования | | |
| | Днев-ная | Заоч-ная | Соис-катель-ство |
| 05.20.01 – технологии и средства механизации сельского хозяйства | 1 | 2 | - |
| 05.20.02 – электротехнологии и электрооборудование в сельском хозяйстве | - | 1 | - |
| 05.20.03 – технологии и средства технического обслуживания в сельском хозяйстве | 1 | 2 | - |
| 05.13.06 – автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (по отраслям) | - | 1 | - |
| 05.14.08 – энергоустановки на основе возобновляемых видов энергии | - | 1 | 1 |
| 05.26.01 – охрана труда (по отраслям) | 1 | - | - |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности) | 1 | 1 | - |

**Прием документов –**
**с 1 августа по 30 сентября 2023 г.**

**Вступительные экзамены по специальности –**
**с 10 по 21 октября 2023 г.**

**Начало занятий –**
**1 ноября 2023 года**

**Адрес приемной комиссии:**
**220012, г. Минск, пр. Независимости, 99, к. 5-1, каб. 504**
**(тел. 8-017-385-91-07)**

УНП 100185315

Научно-методическое учреждение
**«НАЦИОНАЛЬНЫЙ ИНСТИТУТ ОБРАЗОВАНИЯ»**
Министерства образования Республики Беларусь

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ

**за счет средств республиканского бюджета**

**на 2023 год**

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:**

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (3 места на обучение в форме соискательства);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (1 место на обучение в дневной форме, 1 место на обучение в заочной форме);
13.00.03 «Коррекционная педагогика (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия)» (1 место на обучение в дневной форме, 1 место на обучение в форме соискательства);
19.00.07 «Педагогическая психология» (3 места на обучение в форме соискательства).

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ:**

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (1 место на обучение в форме соискательства);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (1 место на обучение в дневной форме).

**Осуществляется также обучение в аспирантуре и докторантуре за счет собственных средств**

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:**

09.00.11 «Социальная философия»;
13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»;
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»;
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия);
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии»;
19.00.05 «Социальная психология»;
19.00.07 «Педагогическая психология»;
22.00.06 «Социология культуры».

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ:**

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»;
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»;
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия);
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии»;
19.00.05 «Социальная психология»;
19.00.07 «Педагогическая психология».

**Прием документов с 1 августа по 29 сентября.**

**Вступительные испытания будут проходить с 2 по 20 октября.**
**Начало занятий – 1 ноября.**

С условиями приема можно ознакомиться в разделе «Аспирантура / Докторантура» национального образовательного портала
**www.adu.by**

Обращаться по адресу: 220004, г. Минск, ул. Короля, 16, каб. 323.
Контактный телефон: +375 (17) 229 19 59.

УНП 190374888

Учреждение образования
«Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ

**за счет средств республиканского бюджета**
**в 2023 году** по следующим специальностям:

| Шифр и название специальности | Аспирантура | | | Докторантура | |
|---|---|---|---|---|---|
| | из них по форме обучения | | | из них по форме обучения | |
| | днев-ная | заоч-ная | соис-катель-ство | днев-ная | соис-катель-ство |
| 03.03.01 – физиология | 1 | | | | |
| 05.20.01 – технологии и средства механизации сельского хозяйства | | | 1 | | |
| 05.23.07 – гидротехническое и мелиоративное строительство | 1 | | | | |
| 06.01.02 – мелиорация, рекультивация и охрана земель | 2 | | | | |
| 06.01.04 – агрохимия | 2 | | 1 | | |
| 06.01.05 – селекция и семеноводство сельскохозяйственных растений | 2 | 1 | | 1 | |
| 06.01.08 – овощеводство | | 1* | | | |
| 06.01.09 – растениеводство | | 1* | | | 2 |
| 06.02.10 – частная зоотехния, технология производства продуктов животноводства | 2 | | | | |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством | 5 | 2 | | | |

*– Форма обучения определяется заказчиком

**Приём документов – с 1 августа по 30 сентября 2023 года.**

Поступающие в аспирантуру на дневную или заочную формы получения образования сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования.

**Прием вступительного экзамена – с 10 по 20 октября 2023 года.**

Подробности на сайте: https://baa.by/

**Наш адрес:** Аспирантура и докторантура, ауд. 434, БГСХА, ул. Мичурина, 5, 213407, г. Горки, Могилевская область, тел. (2233) 79659
Принимаются заявки предприятий реального сектора экономики на подготовку научных работников высшей квалификации.

УНП 700077852

**С 1 августа по 30 сентября 2023 года**

БУДЕТ ОСУЩЕСТВЛЯТЬСЯ ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ
## В АДЪЮНКТУРУ

**Университета гражданской защиты**

**по специальностям:**

05.26.02 – безопасность в чрезвычайных ситуациях
(1 место – получение образования в форме соискательства);
05.26.03 – пожарная и промышленная безопасность
(1 место – получение образования в очной форме;
1 место – получение образования в заочной форме;
1 место – получение образования в форме соискательства).

**Телефон для справок – 8 (017) 345-33-54.**

УНП 192695026

УНП 100079446

Государственное учреждение
**«Научно-практический центр Государственного комитета судебных экспертиз Республики Беларусь»**

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ

**за счет средств республиканского бюджета**
**в форме соискательства по специальностям:**

12.00.16 – судебно-экспертная деятельность (химические науки) – 1 место;
12.00.16 – судебно-экспертная деятельность (юридические науки) – 1 место.

**Прием документов с 1 августа по 30 сентября 2023 г.**

Адрес: 220114, г. Минск, ул. Филимонова, д. 25, тел: 8017 308 60 12.

Подробнее с условиями приема и перечнем документов можно ознакомиться на сайте **http://www.sudexpertiza.by**

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Учреждение образования
**«Белорусская государственная академия музыки»**

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ НА 2023 ГОД В ДОКТОРАНТУРУ И АСПИРАНТУРУ

***за счет средств республиканского бюджета***

**по специальности 17.00.02 Музыкальное искусство**

Прием в аспирантуру осуществляется в дневной форме обучения и в форме соискательства. Количество мест в дневной форме обучения – 4, в форме соискательства – 2. Прием в докторантуру осуществляется в дневной форме обучения – 1 место.

**Прием документов будет проводиться с 28 августа по 29 сентября 2023 года с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Собеседование и вступительные экзамены пройдут **с 9 по 20 октября 2023 года.**

Собеседование для иностранных граждан состоится **27 октября 2023 года.**

Лица, не прошедшие по конкурсу за счет средств республиканского бюджета, могут участвовать в конкурсе для обучения на платной основе.

УНП 100672776

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2023 ГОДУ

**за счет средств республиканского бюджета и на платной основе**

| Специальность | АСПИРАНТУРА* | | | ДОКТОРАНТУРА* | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Дневная | Заочная | Соиска-тельство | Дневная | Соиска-тельство |
| 03.02.07 – генетика | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 07.00.03 – всеобщая история (соответствующего периода) | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 10.01.01 – белорусская литература | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 10.02.02 – русский язык | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| 10.02.20 – сравнительно-историческое, типологическое и сопоставительное языкознание | 0 | 0 | 2 | 0 | 0 |
| 13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования | 2 | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 13.00.02 – теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования) | 4 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 13.00.03 – коррекционная педагогика (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия) | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| 13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 13.00.08 – теория и методика профессионального образования | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 19.00.01 – общая психология, психология личности, история психологии | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 19.00.05 – социальная психология | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| 19.00.07 – педагогическая психология | 2 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| **Итого** | **15** | **0** | **6** | **0** | **1** |

*Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета

Обучение в аспирантуре и докторантуре осуществляется на договорной основе.

**Документы принимаются с 1 августа по 30 сентября 2023 года** (кроме субботы, воскресенья).

С перечнем необходимых документов, требованиями к поступающим, условиями допуска к вступительным экзаменам и зачисления в аспирантуру и докторантуру можно ознакомиться на сайте БГПУ *http://www.bspu.by/Аспиранту/Вступительная кампания.*

**Зачисление в аспирантуру и докторантуру БГПУ с 1 ноября 2023 года.**

Наш адрес:
**220030, г. Минск, ул. Советская, 18, аспирантура и докторантура (каб. 96, 97, корпус 1).**
Телефоны для справок:
**8 (017) 311-20-57,**
**8 (017) 311-20-58.**

УНП 100302394

## В 2023 году в аспирантуру

учреждения образования
**«Мозырский государственный педагогический университет имени И.П. Шамякина»**

## объявлен набор лиц

**по следующим специальностям:**

| Шифр и наименование специальности | Дневная форма | Заочная форма |
|---|---|---|
| 13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования | 1 | |
| 01.04.05 – оптика | 1 | |
| Итого: | 2 | |

Прием документов осуществляется
**с 1 августа по 30 сентября 2023 года**
по адресу: **г. Мозырь, ул. Студенческая, 28, ауд. 220.**

Справки по телефону: **+375 236 23 67 79.**

УНП 400083888

# ДАР З БЕРАГОЎ НЯВЫ НА РАДЗІМУ СВЯТОГА

## У Гомель з Санкт-Пецярбурга перададзены кнігі асабістай бібліятэкі святога праведнага Іаана Кармянскага

**Навіна аб важнай падзеі не толькі для праваслаўных беларусаў, але і для ўсіх людзей, якія шануюць гісторыю роднага краю, прыйшла днямі з Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы. Унікальная калекцыя кніг вярнулася на зямлю, дзе служыў беларускі праведнік. А адбылося гэта якраз у год святкавання 25-годдзя з дня яго праслаўлення ў ліку мясцовашанаваных святых.**

### З пакалення вясковых святароў

Мошчы Іаана Кармянскага — пры жыцці протаіерэя Іаана Гашкевіча — з 1997 года знаходзяцца ў Свята-Пакроўскім храме вёскі Карма Добрушскага раёна. Праз год — з блаславення Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта — адбылася кананізацыя Іаана Гашкевіча і яго праслаўленне ў ліку мясцовашанаваных святых. У 2017 годзе Архіерэйскі Сабор Рускай праваслаўнай царквы прыняў рашэнне аб агульнацаркоўным услаўленні Іаана Кармянскага. Варта нагадаць біяграфію святога, да мошчаў якога сёння няспынна едуць пакланіцца шматлікія паломнікі.

Іаан Гашкевіч нарадзіўся ў 1837 годзе ў беларускай вёсцы Стрэшын. З самага дзяцінства прыслужваў у алтары свайму бацьку — сельскаму святару. У 18 гадоў паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю, а з 1862 года прыняў сан і стаў служыць у вёсцы Шарсцін (цяпер Веткаўскі раён). У 1876 годзе пераведзены ў вёску Агароднія Гомельскага павета. Доўгі час лічылася, што святар памёр у 1917 годзе. У 1950-м царква, у якой ён служыў, згарэла: замест храма ўладкавалі вясковы клуб. У пачатку 1990-х гадоў на гэтым жа месцы нечакана была знойдзена труна з нятленнымі мошчамі Іаана Гашкевіча, якую перавезлі ў Карму.

### Вестка з мінулага

Сёлета, літаральна за некалькі дзён да святкавання дня памяці (31.05) праведнага, у Іаана-Кармянскі манастыр, які цяпер дзейнічае ў аграгарадку Карма Добрушскага раёна, прыйшоў электронны ліст ад Таццяны Байковай з Санкт-Пецярбурга. Карэнная пецярбуржанка паведаміла, што хоча перадаць на Гомельшчыну прыватную калекцыю кніг, якія захоўваліся ў яе сям'і. У жанчыны не было сумненняў, што яны менавіта з бібліятэкі праведнага Іаана Кармянскага — Іаана Гашкевіча. У паўночную сталіцу Расіі па калекцыю кніг з Гомеля накіраваўся старшыня Камісіі па кананізацыі святых Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, протаіерэй Аляксандр Лапушанскі. А тым часам кнігі самі падказалі, як амаль век таму бібліятэка трапіла з Гомельшчыны ў Санкт-Пецярбург.

— Усяго было знойдзена 59 кніг, — расказвае протаіерэй Аляксандр Лапушанскі. — Практычна на ўсіх ёсць штамп з надпісам «Протаіерэй Іаан Іаанавіч Гашкевіч». Надпіс зроблены па правілах дарэвалюцыйнай арфаграфіі. На некаторых кнігах на штамп нанесены подпіс, зроблены пёравай ручкай, «З кніг свяшчэнніка Іаана Гашкевіча» з пастаўленай датай.

Без сумненняў, усе перададзеныя кнігі былі выдадзены яшчэ пры жыцці протаіерэя Іаана Гашкевіча і знаходзіліся ў яго сямейнай бібліятэцы. Пры гэтым па датах выданняў можна сцвярджаць, што бібліятэка фарміравалася не адным годам. Хутчэй за ўсё збор кніг папаўняўся дзякуючы малодшаму сыну протаіерэя — святару Іаану Гашкевічу-малодшаму. Ён быў поўны цёзка свайго бацькі. Надалей гэтая бібліятэка перайшла ў яго ўласнасць.

— Вядома, што, паддаўшыся ўсеагульнай эйфарыі розных дэмакратычных пераўтварэнняў пострэвалюцыйнай эпохі, сын Іаана Гашкевіча, як і многія свяшчэннаслужыцелі, захапіўся новым рухам у Царкве. Тым, што мы цяпер называем абнаўленцтвам, — тлумачыць старшыня Камісіі па кананізацыі святых Гомельскай епархіі. — Айцец Іаан малодшы дасягнуў у гэтым руху дастаткова вялікіх вышынь: ён стаў членам Сінода Беларускай праваслаўнай царквы і ўпаўнаважаным па Гомельскай акрузе. Фактычна гэта быў адзін з самых высокапастаўленых святароў таго часу ў нашым рэгіёне ў абнаўленчым асяроддзі. Іаана Гашкевіча-малодшага арыштавалі ў 1937 годзе разам з жонкай Еўдакіяй. На допытах следчыя патрабавалі ў мужа і жонкі ў тым ліку выдаць месца знаходжання сямейных архіваў. Але яны так і не прызналіся ў гэтым. Таксама свяшчэннік і яго матушка Еўдакія не раскрылі месца знаходжання іх адзінай дачкі — Еўдакіі (як і маці) Гашкевіч.

Яна ж ужо ў ваенныя гады выйшла замуж за жыхара Ленінграда Івана Фёдаравіча Кляшчэвіча і ўзяла прозвішча мужа.

— У 2000 годзе архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх па просьбе гомельскіх краязнаўцаў зрабіў запыт у пашпартны стол Санкт-Пецярбурга, каб знайсці інфармацыю пра Еўдакію Гашкевіч, — дадае протаіерэй Аляксандр Лапушанскі. — З адказу стала вядома яе прозвішча па мужу. Вядома, што Еўдакія Кляшчэвіч працавала на Віцебскім вакзале ў Ленінградзе. Памерла яна ў 1949 годзе, ёй быў толькі 31 год.



Кнігі асабістай бібліятэкі святога праведнага Іаана Кармянскага прыбылі ў Гомельскую епархію Беларускай праваслаўнай царквы.

### Сямейную калекцыю зберaглі ў «камуналцы»

Усё жыццё бярог памяць аб сваёй жонцы Іван Фёдаравіч Кляшчэвіч. Ён і захаваў бібліятэку сям'і Гашкевічаў. У канцы свайго жыцця ленінградзец перадаў кнігі свайму пляменніку — Уладзіміру. Яго дачка — Таццяна Уладзіміраўна Байкова — і стала апошняй уладальніцай калекцыі, і вось цяпер перадала яе на Гомельшчыну.

Таццяна Уладзіміраўна падзялілася, што ў дзяцінстве часта хадзіла ў госці да сям'і сваёй стрыечнай бабулі Алены Сяргееўны — другой жонкі Івана Фёдаравіча Кляшчэвіча. Жылі яны ў камунальнай кватэры, у вельмі маленькім пакойчыку. Іван Фёдаравіч, па яе ўспамінах, быў чалавек глыбокай веры. У савецкі час, нягледзячы на ўсе забароны, рэгулярна наведваў храм і нават рабіў аўдыязапісы на грампласцінкі са службы і потым уключаў іх сваім блізкім: каб паслухалі выдатныя царкоўныя спевы.

— Я не ведала аб тым, што ў бацькі знаходзіцца перададзеная бібліятэка. Калі ён памёр, я, разбіраючы ягоныя рэчы, знайшла гэтыя кнігі. Пачала шукаць у інтэрнэце: хто ж такі Іаан Іаанавіч Гашкевіч? Калі знайшла, то ў мяне адразу ўзнікла думка вярнуць кнігі ў месца іх першапачатковага знаходжання. Я спытала парады ў знаёмага свяшчэнніка, ён параіў аднесці кнігі ў адзін з пецярбургскіх храмаў, але мяне нешта спыніла. Падумала, што гэта будзе няправільна. Пазней напісала ліст у Кармянскі манастыр і хутка атрымала адказ. Цяпер магу перадаць са спакойнай душой, з глыбокай павагай гэтую бібліятэку. Упэўнена, што яна захаваецца на доўгія гады, можа, на стагоддзі і яшчэ больш людзей будуць ведаць пра кармянскага святога Іаана Іаанавіча і яго сям'ю, — распавяла Таццяна Уладзіміраўна Байкова.

### Найстарэйшаму выданню — больш за 160 гадоў

У перададзенай бібліятэцы — пераважна кнігі багаслоўскага характару. Іх змест адпавядае тагачаснай вучэбнай праграме Магілёўскай духоўнай семінарыі. Гады выдання кніг супадаюць з часам навучання сыноў айца Іаана ў гэтай навучальнай установе. Не выключана, што айцец Іаан мог набываць гэтую літаратуру менавіта для іх.

— Пералік кніг сведчыць аб коле інтарэсаў іх уладальнікаў і іх культуры. Літаратура пераважна сур'ёзнага багаслоўскага характару і, нягледзячы на тое, што на кнігах не было цвёрдай вокладкі (рабілася гэта для зніжэння цаны), захаваліся ў вельмі добрым стане. Большасць кніг была раскладзена ў кардонныя папкі, згодна з тэматыкай іх зместу: аўтар да аўтара, том да тома, — звяртае ўвагу протаіерэй Аляксандр Лапушанскі. — Асобнае месца займаюць кнігі, якія выкарыстоўваліся для навучання дзяцей у царкоўнапрыходскай школе. Гэта «Навучальны Псалтыр», выдадзены ў 1913 годзе і «Жыцці святых» за шэсць месяцаў, датаваныя 1884 годам з грыфам «навучальны дапаможнік для народных вучылішчаў». На часопісе «Праваслаўны агляд» за 1861 год ёсць рукапісны надпіс «вучнёўская бібліятэка». Верагодней за ўсё, гэта кнігі, па якіх свяшчэннікі вучылі дзяцей Закону Божаму ў Агародненскай царкоўнапрыходскай школе. Як мы ведаем, сам праведны Іаан быў законанастаўнікам у гэтай школе. Пасля бацькі на гэтае месца заступіў яго малодшы сын Іван.

Сёння рарытэтныя кнігі перададзены ў фонды епархіяльнага старажытнасховішча для рэстаўрацыі. Пасля гэтага на аснове бібліятэкі будзе створана экспазіцыя, прысвечаная святому праведнаму Іаану Кармянскаму.

— Яна стане важнай крыніцай інфармацыі для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Гомельшчыны, — перакананы старшыня Камісіі па кананізацыі святых Гомельскай епархіі протаіерэй Аляксандр Лапушанскі. — Гэтыя кнігі — вялікае для нас адкрыццё, якое дазволіць па-новаму паглядзець на жыццё і служэнне дзіўнай сям'і — сям'і Гашкевічаў. Бягучы год, час святкавання 25-годдзя з дня праслаўлення святога праведнага Іаана Кармянскага ў ліку мясцовашанаваных святых, стаў сапраўды багатым на адкрыцці і новыя факты, якія датычацца жыцця і служэння святога. Гэтыя факты праліваюць святло на прабелы ў яго біяграфіі. Адным з такіх унікальных дакументаў стаў знойдзены метрычны запіс аб дні і абставінах смерці айца Іаана. Зыходзячы з яго, стала вядома, што праведны Іаан Кармянскі памёр 27 красавіка (па новым стылі) 1919 года. Сярод наноў адкрытых матэрыялаў — богаслужэбныя дзённікі свяшчэнніка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота і матэрыялы дадзены Гомельскай епархіяй Беларускай праваслаўнай царквы.**



Фота протаіерэя Іаана Гашкевіча, якое захавалася.

**— Айцец Іаан Кармянскі — унікальная асоба ў цэлым для гісторыі Рускай праваслаўнай царквы. Ён стаў адным з першых святых, хто быў кананізаваны з ліку свецкіх святароў. Да гэтага найчасцей услаўляліся і кананізаваліся манахі. Айцец жа Іаан жыў паўнацэнным сямейным жыццём. З'яўляўся шматдзетным бацькам — у яго было сямёра дзяцей. Тым часам менавіта ён, мірскі чалавек, змог дасягнуць сапраўднай набожнасці. Гісторыя жыцця гэтага чалавека — яскравы прыклад таго, што Евангелле напісана для кожнага, а яго ідэал аднолькавы для ўсіх. Лёс гэтага чалавека — прыклад для нас: не важна, хто шчыра трымаецца запаведзяў Хрыста: манах, святар або іншы чалавек, любой прафесіі ці прызвання — усё дасягальнае. Хрысціянін пры любых жыццёвых абставінах заўсёды павінен заставацца хрысціянінам, — заўважыў старшыня Камісіі па кананізацыі святых Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, протаіерэй Аляксандр ЛАПУШАНСКІ.**

# «На стале разгорнута, як карта, яркая вялізная «Звязда»

## Як пісалі пра нашу газету ў літаратурных творах

**За больш чым векавое жыццё «родная газета на роднай мове» «Звязда» мела стасункі, напэўна, з усімі заўважнымі беларускімі літаратарамі. У ёй друкавалі творы, чыталі рэцэнзіі і справаздачы з літаратурных мерапрыемстваў, удзельнічалі ў дыскусіях і змяшчалі адозвы... Пісьменнікі і паэты былі супрацоўнікамі газеты і яе карэспандэнтамі. На старонках «Звязды» друкаваліся ўказы аб узнагароджаннях пісьменнікаў, адзначаліся юбілеі, друкаваліся некралогі, абнародаваліся рэдкія архіўныя знаходкі датычна гісторыі беларускай літаратуры...**

**Натуральна, што «Звязда» трапляла і ў самі літаратурныя творы. Давайце ўспомнім некаторыя з такіх згадак.**

### «Каб жыла, квяцілася далей безустанне»

Пачнём з самай вядомай постаці і вядомага верша. 30 ліпеня 1934 года выйшаў пяцітысячны нумар «Звязды». На другой паласе ў цэнтры быў змешчаны верш Янкі Купалы «Звяздзе»:

*Пяць тысяч — не жарты*
*Нумароў з запалам*
*«Звязда» наша слаўная*
*Ўжо надрукавала.*
*Пяць тысяч — не жарты вам —*
*Ды тут — на фарпосце,*
*Ад рукі варожае*
*Дзе йшчэ тлеюць косці.*
*Пяць тысяч — не жарты вам —*
*Праз гадоў шаснаццаць*
*«Звязда» з подлым ворагам*
*Мусіла змагацца...*
*Скажам жа ёй шчырае*
*Наша пажаданне:*
*Каб жыла, квяцілася*
*Далей безустанне.*

### «А зорку назвалі «Звяздою»

*«Ён заўсёды быў такі — адкрыты, спагадлівы, чулы. Да вайны, помню, сустрэліся на сцежцы ў блакітным лёне. Адзін на адзін сустрэліся ўпершыню, сышоўшы з цягніка на станцыі Бабёр. Я адразу пазнаў яго, павітаўся:*

*— А куды вы, даруйце...*

*— У камандзіроўку. Нарыс буду пісаць.*


„ЗВЯЗДЗЕ"
ЯНКА КУПАЛА

*— І я па нарыс. Для «Звязды».*

*— Ну, тады адна дарожанька».*

Так успамінаў Анатоль Вялюгін пра Пятра Глебку. Сапраўды, Пятро Глебка — заўсёднік на старонках «Звязды». У нумары за 9 жніўня 1927 года, прысвечаным дзесяцігоддзю газеты, ён друкуе верш пад назвай «Дзянніца», з пазнакай даты напісання 7.08.27:

*Не помню, не знаю, у якой старане:*
*На ўсходзе, на захадзе мора,*
*У хмарах у чорных —*
*спрадвечнай багне*
*Пару ахінула прыгожасць.*
*Дзівіліся людзі на гэту зару,*
*У косы ўплялі прамене,*
*Казалі: «Цяпер закалосіца рунь*
*На дзікім, на жорсткім камені».*
*А зорка свяціла, паказвала шлях,*
*Лілася на жвір сырадоем.*
*Загэтым зацвітваць стала зямля,*
*А зорку назвалі «Звяздою».*

У 5000-м нумары газеты таксама быў надрукаваны верш Глебкі пад назвай «Звязда»:

*«Хадзяць зоры над краінай нізка...*
*Досвіткам, калі чуць-чуць відно,*
*Самая вялікая зарніца*
*Падае ў маё вакно.*
*Рассыпаецца ў мільёнах літар*
*Роўнымі шарэнгамі радкоў,*
*Разрываецца магутным дынамітам*
*Радасных і гнеўных слоў.*
*І чуваць выразна ў словах трубных,*
*Як магутнае жыццё пяе —*
*Я чытаю пройдзены й наступны*
*Шлях рэспублікі мае.*
*Малады, напорысты, упарты,*
*Я імкнуся па яе слядах;*
*На стале разгорнута, як карта,*
*Яркая вялізная «Звязда».*

### «Прапішы-ка ты ў газету нам пра вясковае жыццё у нас...»

Паэт Сяргей Дарожны, ён жа Сяргей Серада, меў першы зборнік вершаў ужо ў сямнаццаць гадоў, яго вершы моладзь завучвала на памяць. Шчыры, дапытлівы, смелы хлопец «засвяціўся» ў многіх літаратурных падзеях таго часу, сярод іншага — быў у ліку студэнтаў Белпедтэхнікума, якія паслалі ў «Камсамольскую праўду» ліст у абарону Сяргея Ясеніна, пасля таго як у гэтай газеце ў 1926 годзе быў размешчаны артыкул крытыка Сасноўскага «Развенчайте хулиганство». За «ясеніншчыну» жорстка нападалі і на самога Сяргея Дарожнага. І калі мы пачытаем надрукаваны ў першым нумары «Звязды» 1928 года яго верш, прысвечаны «Звяздзе», дакладна пачуем ясенінскія інтанацыі:

*На стале ў мяне,*
*Сярод газет*
*З вёскі прысланы ўчора ліст.*
*Словы простыя, як альфабэт,*
*У радках няроўных зацвілі.*
*Пішуць мне яны:*
*«Здарова, брат,*
*Напісаць табе, што выпіць квас.*
*Прапішы ка ты ў газету нам*
*Пра вясковае жыццё у нас.*
*А яшчэ, браточак,*
*Прапішы,*
*Старшыня ў нас, ведаеш, Сапрон,*
*Ён з «чужымі» у начной цішы*
*Распівае заўжды самагон.*
*І каб ведалі*
*Не толькі мы,*
*Напішы на першую старонку:*
*Школа новая ў нас ад зімы,*
*І чытальня,*
*Дзе была карчомка.*
*...Ліст прачытаны,*
*Ціхая радасць,*
*Доўга ў мыслях кружыла маіх.*
*Вось ты дзе, саламяная праўда.*
*Гэткіх дальніх,*
*Сярмяжных сваіх.*
*...І назаўтра,*
*(З вясной напалову)*
*У скрутку газетных папер*
*Я прынёс у рэдакцыю новы*
*Гэтак проста напісаны*
*Верш.*

### «Крэпасці мы бралі са «Звяздой»

А вось сябра Сяргея Дарожнага, Тодара Кляшторнага, нават называлі «беларускім Ясеніным». Агульны крытык Лукаш Бэндэ называў яго «пілікаючым лірнікам», чые «мінорныя гукі пілікання нікому не патрэбны». Паэт спрабаваў «перавыхавацца», пісаць у пафаснай, дэкларатыўнай стылістыцы. Ягоны верш «Жыватворчыя агні», прысвечаны дзесяцігоддзю «Звязды», таксама пафасны:

*Дні ў агнях раз'ятраных палалі,*
*Беглі дні суровай чарадой.*
*Са «Звяздой» мы далі штурмавалі,*
*Крэпасці мы бралі са «Звяздой».*
*І ў баях, пад кулямі, вятрамі,*
*І пад гулкі гоман перамог*
*Бальшавіцкай партыі пражэктар*
*Нам свяціў у змрочнасць*
*даль-дарог...*
*...Дні за працай беглі ўперагонку,*
*Беглі дні упартай чарадой.*
*На звяздоўскіх шэрыках старонках*
*Выхаван ударнік і герой.*

### «Назва страшная, і папрок цяжкі»

А вось які цікавы эпізод, звязаны са «Звяздой», згадвае ў аўтабіяграфічнай аповесці «Кругі» Янка Скрыган:

*«У 1931 годзе з брыгадаю «Звязды» ездзіў на «Гомсельмаш». Там мы жылі каля трох месяцаў — Брайнін, Паваротны і я. Днём ішлі на завод, а ўвечары, у гасцініцы, усеўшыся за круглым сталом, пісалі карэспандэнцыі ў газету».*


ПЯТРО ГЛЕБКА
„ЗВЯЗДА"

Цікавая паездка мела для маладога пісьменніка непрыемныя наступствы, з якіх яму дапамог выбрацца Платон Галавач:

*«Памятаю, пасля таго як я вярнуўся з «Гомсельмаша», дзе тры месяцы працаваў з брыгадаю «Звязды» па ліквідацыі прарыву, у мяне была даволі непрыемная гісторыя. Я напісаў серыю нарысаў і надрукаваў іх у «Маладняку». Неўзабаве паявіўся артыкул пра гэтыя нарысы пад назвай «Паклёп на завод». Назва страшная, і папрок цяжкі. Але Галавач адразу ўбачыў тут несумленнасць і без ніякіх ваганняў стаў на абарону. Ён увайшоў у камісію па вывучэнню справы і не адступіўся да таго часу, пакуль не дамогся, каб давесці, што ў рэцэнзента былі нячыстыя рукі. Выйшла вельмі простая рэч: рэцэнзентам, што схаваўся за псеўданім, быў чалавек, які прэтэндаваў стаць сааўтарам нарысаў, хоць сам не напісаў ні радка».*

### «Даразбаўляліся, што не выстарчыла на чыгуначны білет»

Зборнік Сяргея Грахоўскага «Так і было» — гэта шчымлівыя, кранальныя ўспаміны пра цэлае літаратарскае пакаленне, прарэджанае рэпрэсіямі і вайной. Сярод іншых там ёсць нарыс «Рэквіем па другу» пра паэта Юрку Лявоннага, «маладога, статнага і прыгожага юнака, трошкі артыстычнага склада, з густымі каштанавымі валасамі, у шчыгульным шэрым касцюме ў дробную клетачку, у белай кашулі з модным гальштукам». Яны пазнаёміліся ў Мінску ў 1931 годзе.

*«Неўзабаве мы сталі з Юркам блізкімі сябрамі: хадзілі адзін да аднаго без папярэджанняў і запрашэнняў. Ён працаваў у рэдакцыі «Звязды» і адначасова вучыўся на крытычна-творчым аддзяленні літфака педінстытута, я быў стыльрэдактарам і адказным за літаратурныя старонкі ў «Чырвонай змене» і студэнтам газетна-выдавецкага аддзялення педінстытута. Юрка вучыўся курсам вышэй за мяне, мы часта разам ездзілі на заняткі, на перапынках шпацыравалі па доўгіх калідорах...*

*Вучэнне нам не замінала часта адлучацца ў камандзіроўкі. Асабліва аператыўным карэспандэнтам быў Лявонны. У 1934 годзе «Звязда» даручыла яму і мне падрыхтаваць разварот пра дасягненні новых МТС і палітаддзелаў памежнай Полацкай акругі. Мы прыехалі снежнаю зімою ў скарынінскі Полацк. Там яшчэ не сцерліся сляды слаўнай даўніны. У Полацку тады працаваў сакратаром рэдакцыі акруговай газеты ўжо вядомы аўтар аповесці «Тэорыя Календрун» Эдуард Самуйлёнак. Ён прыходзіў вечарамі ў наш гасцінічны нумар — высокі, белатвары, з «лордаўскім» носам, у вялікіх рагавых акулярах. Часта нашы гаворкі зацягваліся далёка за поўнач. Дасведчаны Эдуард быў лідэрам у размовах і пераможцам у спрэчках. У грубцы смажылася сялянская каўбаса, і мы пад не сёе-тое пілі, па купалаўскаму рэцэпту, разбаўляючы нарзанам. Даразбаўляліся, што не выстарчыла на чыгуначны білет і давялося ісці ў пазычкі. Затое разварот выйшаў пра суцэльныя поспехі і дасягненні — баявы і ўзнёслы».*

### Як карэспандэнт «Звязды» Чкалава сустракаў

У рамане-дзённіку «Сем гадоў у ЦК» сучасны беларускі пісьменнік, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Уладзімір Гніламёдаў успамінае яшчэ адзін цікавы штрых з жыцця «Звязды»:

*«Нядаўна бачыўся з былым рэдактарам «Полымя» Паўлам Кавалёвым. Кавалёў — добры субяседнік. Пра «Полымя» ён аднак не ўспамінаў, а расказваў пра тое, як ажно ў 1937 годзе, у Негарэлым, сустракаў Валерыя Чкалава і яго сяброў па пералёце на АНТ-25 праз Паўночны полюс у Амерыку. Маладога журналіста Кавалёва паслала на гэтую сустрэчу газета «Звязда», дзе ён працаваў. Яго здзівілі лётчыкі-героі Чкалаў, Белякоў і Байдукоў, якія гарэлі энтузіязмам, жаданнем працаваць, тварыць, ставіць рэкорды. Пагранічнік, вітаючы лётчыкаў, на высокіх пачуццях сказаў:*

*— Таварышы! Над снежнымі прасторамі Арктыкі, Паўночным полюсам, полюсам непрыступнасці, ваш матор спяваў пераможныя песні краіны сацыялізму, мы гатовы былі ў любую хвіліну аддаць вам сваю кроў, каб матор не спыняў гэтай песні!»*

### «У Саюз мяне прынялі»

Пра тое, якую ролю адыграла «Звязда» ў жыцці Уладзіміра Караткевіча, піша Адам Мальдзіс у кнізе «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча». Пасля таго,


Пятро Глебка.
Дзяньніца.

як у аршанскай газеце «Ленінскі прызыў» была надрукаваная падборка вершаў Караткевіча, на маладога паэта накінуліся мясцовыя «знаўцы» «за безнадзейнасць, чорную меланхолію, захапленне гісторыяй. Адным словам — за безыдэйнасць». Былі арганізаваныя лісты ў рэдакцыю, спецыяльная канферэнцыя «абураных» чытачоў на льнозаводзе. Караткевічу давялося нават зволіцца са школы, дзе ён працаваў настаўнікам, і з'ехаць у Маскву, на Вышэйшыя літаратурныя курсы. Гісторыя ўсплыла, калі трэба было ўступаць у Саюз пісьменнікаў: *«Пасыпаліся абураныя лісты ў Мінск, Глебка з Казекам выступілі ў маю абарону ў «Звяздзе». У Саюз мяне прынялі».*

І яшчэ адна цікавая згадка, якая датычыцца лёсу рамана «Каласы пад сярпом тваім». Сярод тых, хто зацята выступаў супраць публікацыі твора, быў крытык Герцовіч: *«Абмярканне «Каласоў...» у Саюзе пісьменнікаў БССР, галасы грамадскасці ўсё ж зрабілі сваю добрую справу. Алесь Адамовіч прайграў бы заклад, бо асобнае кніжнае выданне рамана пабачыла свет не праз пяць гадоў, а хутчэй — у 1968 годзе. На гэты раз Герцовіч змаўчаў (скардзіўся толькі на адной высокай нарадзе, што ў сувязі з яго артыкулам пра Караткевіча нават «Звязда» патрабуе, каб ён прызнаўся псеўданімам, на што Адамовіч падаў рэпліку: «Гэта робіць гонар «Звяздзе»)».*

Што ж, гісторыя «Звязды» працягваецца, шчыльна пераплеценая з гісторыяй беларускай літаратуры. І, як пісаў паэт Віктар Шніп у вершы, прысвечаным 100-годдзю нашага выдання:

*Напачатку было Слова.*
*І ў Слове была Любоў*
*Да роднай мовы, да роднай зямлі,*
*да волі,*
*Да праўды, да Беларусі.*
*Якая пачынала свой новы шлях*
*І якая працягвала шлях продкаў,*
*Працавітых, мужных і слаўных,*
*Чые імёны залатымі літарамі*
*Пазначаны ў нашай гісторыі,*
*Якую ніхто і ніколі*
*не перакрэсліць*
*І не перапіша, бо нельга*
*перапісаць тое,*
*Што пражыта народам*
*І што стала Славай і Словам,*
*І Словам, якое стала газетай...*
*І мы чытаем гэтую газету,*
*І мы любім гэтую газету,*
*І гэта газета заўсёды з намі,*
*І гэта газета на нашай*
*роднай мове,*
*І гэта газета «Звязда».*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Алесь БАДАК

# З НОВАЙ КНІГІ «АНЁЛ МОЙ»

**Ніколі, нават у пару юнацтва, я не пісаў шмат, як ніколі не зайздросціў тым, для каго гэты працэс — фактычна, няспынная вытворчасць. Само па сабе яно ні добра, ні кепска. Адны любяць хуткую язду, іншыя — хадзіць пешшу. Хуткі больш пабачыць, марудны лепш разгледзіць. Кожнаму сваё. І ў жыцці, і ў паэзіі. Пісаць — значыць ствараць цэлы свет, нават калі ў выніку напішацца чатырохрадкоўе. Як правіла, чытач бачыць толькі частку гэтага свету, яму няўцям, колькі вобразаў, колькі дэталяў могуць так і застацца ў галаве аўтара ці ў чарнавіках.**
**Як няўцям, што аўтару, бывае, зусім не хочацца развітвацца з прыдуманым ім светам, які, з'явіўшыся на старонках газеты, часопіса, кнігі, — нібы застывае ў часе: у ім не адбываецца нічога апроч таго, што было прыдумана падчас напісання. Таму працэс стварэння куды больш хвалюючы ў параўнанні з усім, што можа быць пасля. Пакуль пішаш — ты валадар свайго свету, ты можаш сто разоў змяніць яго альбо ўвогуле спапяліць і на гэтым папялішчы пасля пабудаваць нешта іншае, новае.**
**Кніга «Анёл мой» таксама пішацца паволі, паступова напаўняючыся новымі героямі, новымі гарадамі і вёскамі, лясамі і рэкамі, жывёламі і птушкамі. Я люблю гэты свет. Люблю не толькі таму, што ён — часцінка майго жыцця, маіх душэўных настрояў і жаданняў. А, можа, найперш таму, што натхнялі і натхняюць на яго стварэнне рэальныя людзі ды родная зямля — цудоўная і непаўторная.**



## ДУШНАЯ НОЧ

*За поўнач. Душна. Ты не спіш.*
*То мнеш вільготную падушку,*
*То ў столь задумліва глядзіш.*
*Плюс дваццаць дзевяць.*
*Ліпень. Душна.*

*Найлепшы гукаправаднік —*
*Начная цішыня ў пакоі.*
*Ты чуеш ясна ў цішыні:*
*Як духі, гукі над табою.*

*Там суха кашляюць, бубняць,*
*Ці тупат чуеш глухаваты.*
*Як ты, паверхі ўсе не спяць —*
*Ад трэцяга і па дзявяты.*

*І ў гэтай цёмнай духаце,*
*Пад гэтай масаю над столлю*
*З канапаў, крэслаў, мокрых цел —*
*Як з клеткі, хочацца на волю.*

*Каб хоць пад раніцу паспаць,*
*Ты станеш думаць пра другое,*
*Пра тую, што ўжо тыдняў пяць*
*Жыве ў кватэры за сцяною.*

*І, можа, зараз — ноч пакуль —*
*Так блізка вы, што нават смешна,*
*Што проста выцягнеш руку —*
*І дакранешся!*

*І перад тым, як прыйдуць сны,*
*На бок павернешся нягучна,*
*Каб з ёй — спіною да спіны —*
*Ляжаць, забыўшыся, што душна.*

***

*Які ёсць ужо ён, які ёсць,*
*Да краёў і яму наліваю.*
*Будзь здаровы, няпрошаны госць,*
*Чыё вечна імя забываю!*

*Які ёсць ужо ён, які ёсць,*
*Мой зусім ненадзейны таварыш.*
*Дык і дзелім з ім разам не лёс,*
*А ўсяго толькі прывіды-мары.*

*Які ёсць ужо ён, які ёсць,*
*Самы лепшы мой сябар сягоння.*
*Але вельмі далёка пагост,*
*Каб часцей прыязджаць да яго мне.*

*Я і сам, я і сам які ёсць,*
*З векавою самотай на твары.*
*Для кагосьці — няпрошаны госць,*
*Для каго — ненадзейны таварыш.*

*Я і сам, я і сам кожны раз,*
*Калі сябра наведваю зрэдку,*
*Як і ён, станаўлюся на час*
*Там то птушкай, то ветрам, то кветкай...*

***

*Засвеціць сонца восеньскае ў вокны,*
*І чмель на падаконні ажыве.*
*Яму падасца, беднаму, што звонку*
*Зноў лета хмельным водарам плыве.*

*Ён загудзе, заб'ецца ў шыбу сонна.*
*Туды, туды, дзе позніх кветак бель.*
*Ды ў восені кароткі час на сонца.*
*І падае на падаконне чмель.*

*Вось так і ты падчас жыццёвай драмы,*
*Калі цяпла на сэрцы не стае,*
*Убачыш раптам за дзвярною рамай*
*Уранку неадзетую яе,*

*І ажыве каханне, і сагрэе,*
*Як некалі, пакуль былі сям'ёй.*
*Але яна зачыніць рэзка дзверы,*
*І зноўку сэрца выстыне тваё.*

***

*«Чаму ў кіно не так, як у жыцці?!» —*
*У часу маладосць мая пытала.*
*Не верыла, не слухала, шукала*
*Прычыны там, дзе век іх не знайсці.*

*Я не скажу, што мне ўжо ўсё адно,*
*Хоць з той пары*
*і шмат чаго не стала.*
*«Чаму ў жыцці не так, як у кіно?!» —*
*У вечнасці адказ шукае сталасць.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## КАХАЮ І ЛЮБЛЮ

*Салаўіны спеў праз сон лаўлю,*
*І праз сон цябе я абдымаю.*
*І шапчу: «Кахаю і люблю»,*
*Матыльком над светам узлятаю.*

*Новы дзень прыходзіць на зямлю.*
*Расчыню акно — вароты раю!*
*І хачу я ўсім казаць «люблю»,*
*Ды адной табе казаць «кахаю».*

*Дзе любоў — там вечнае свята.*
*Дзе свята — там вечнае каханне.*

*Не шкадуйце самых шчырых слоў,*
*Самага прыгожага прызнання.*

*Калі вам не хопіць слоў сваіх,*
*Вы іх, каб пасля ўжо не забыцца,*
*На жыццё займіце ці на міг*
*У лістоты, птушак і крыніцы.*

*Салаўіны спеў праз сон лаўлю,*
*І праз сон цябе я абдымаю.*
*І шапчу: «Кахаю і люблю»,*
*Матыльком над светам узлятаю.*

## НІХТО

*Яна — ніхто. Але ў маёй кватэры*
*Ключом уласным адчыняе дзверы.*

*Заходзіць — як заходзяць гаспадыні.*
*Ні разу позірк у мой бок не кіне.*

*У чым прыйшла —*
*здымае бессаромна,*
*Нібыта не ў гасцях яна, а дома.*

*(І тоненькі халацік так дарэчы*
*Сабой прыкрые ёй не толькі плечы).*

*Яна гатуе лёгкую вячэру,*
*Гартае на стале маім паперы.*

*Ёй кожны верш —*
*як фірменная страва.*
*За кожнай рыфмай бачыць маю славу.*

*Чытанне — праца,*
*нам даўно вядома.*
*А госця не збіраецца дадому.*

*Яна з сябе апошняе здымае*
*І на маёй пасцелі засынае.*

*Ды толькі адвярнуся на хвіліну —*
*Ужо я зноў адзін, а не адзіны.*

*Яе няма. Аднак няма і болю:*
*Яна мая фантазія, не болей,*

*Мой ідэал, з якім сябе не чую.*
*Сам Бог ні разу не стварыў такую.*

*Але ў жыцці ўсяму свая ёсць мера.*
*І я ў ёй заўважаць стаў перамены.*

*З сябе яна ўсё нехаця здымае.*
*На кухню больш ужо не зазірае.*

*І ёй цяпер не так цікава першай*
*Прачытваць мной напісаныя вершы.*

*І нават у пасцель раней кладзецца,*
*Каб некуды хутчэй*
*з кватэры дзецца.*

*Ну што ж, на ўсё заўсёды*
*ёсць прычына:*
*Жанчына — і ў фантазіях*
*жанчына!*

***

*У вёсачцы ціхай, бязлюднай амаль што,*
*Дзе птушкі чародкай садзяцца ля ног,*
*Дзе ты матылька на далоні трымаеш,*
*І дзіўную блізкасць ён лёгка прымае, —*
*У гэтым раі ты пустэльнік ці бог?*

*Без сувязі тут усялякай са светам,*
*Ты слухаеш птушак навіны штодня.*
*І ўсё разумееш у мове іх вечнай.*
*Ад кожнай навіны на сэрцы так светла,*
*І птушкі — не людзі —*
*табе ўжо радня.*

*І быццам ні гэтай,*
*ні іншай парою*
*Няма на зямлі больш ні гора, ні бед.*
*І быццам за лесам,*
*што побач сцяною,*
*Адразу, адразу канчаецца свет.*

Результаты проведения рекламной игры

# «ЧИСТАЯ РАДОСТЬ»

**Сведения о рекламной игре:**
Наименование рекламной игры: «Чистая радость».
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения:
с 16 марта 2023 года по 30 июня 2023 года.
В рекламной игре приняли участие 1 095 участников.
Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

**Победителями стали**

| № | Наименование приза | Кол-во, шт. | ФИО победителя |
|---|---|---|---|
| 1 | Блендер погружной Redmond RHB-2997 (белый) | 7 | Данильчук Анна Николаевна |
| | | | Забавская Ангелина Олеговна |
| | | | Булла Наталья Анатольевна |
| | | | Качанко Елена Федоровна |
| | | | Головач Нина Сергеевна |
| | | | Никитина Тамара Михайловна |
| | | | Тарасова Елена Владимировна |
| 2 | Электрическая зубная щетка Xiaomi Mi Smart Electric Toothbrush T500/MES601/NUN4087GL | 8 | Таранько Валентина Александровна |
| | | | Маньковская Елена Александровна |
| | | | Алексейчикова Наталья Вячеславовна |
| | | | Лях Анастасия Сергеевна |
| | | | Духновская Ирина Леонидовна |
| | | | Братанова Ольга Александровна |
| | | | Дашкевич Наталья Владимировна |
| | | | Белоцкий Владимир Владимирович |
| 3 | Кухонные весы Atuman ES1 (3KG) | 8 | Герц Александра Ивановна |
| | | | Раинчик Екатерина Ивановна |
| | | | Гудкова Евгения Сергеевна |
| | | | Струнец Оксана Николаевна |
| | | | Пашковская Елена Станиславовна |
| | | | Лавинская Галина Игнатьевна |
| | | | Линина Людмила Ивановна |
| | | | Ковалева Ирина Викторовна |
| 4 | Мультиварка Centek CT-1472 Ceramic и денежные средства в размере 7,92 белорусских рублей | 8 | Крагель Инна Ивановна |
| | | | Отто Ольга Руслановна |
| | | | Трухан Иван Викторович |
| | | | Кондрашкова Инна Владимировна |
| | | | Жудрик Надежда Адамовна |
| | | | Корнилов Виктор Сергеевич |
| | | | Афанасенко Михаил Николаевич |
| | | | Моисеева Ольга Алексеевна |
| 5 | Электрочайник Aresa AR-3463 | 7 | Дудо Вадим Александрович |
| | | | Шестопалова Раиса Николаевна |
| | | | Силивончик Зинаида Куприяновна |
| | | | Бобрик Татьяна Андреевна |
| | | | Губич Елена Владимировна |
| | | | Киселева Татьяна Васильевна |
| | | | Лавринчук Елена Васильевна |
| 6 | УФ-стерилизатор Gess GESS-113 | 8 | Кондратьева Татьяна Александровна |
| | | | Казакевич Полина Михайловна |
| | | | Новик Марина Александровна |
| | | | Кот Диана Сергеевна |
| | | | Асадчая Ирина Николаевна |
| | | | Рынкевич Оксана Анатольевна |
| | | | Калько Иван Георгиевич |
| | | | Савиных Элла Сергеевна |
| 7 | Сэндвичница Brayer BR2200 | 5 | Еровченко Наталья Сергеевна |
| | | | Гришкевич Светлана Ивановна |
| | | | Бурмако Алёна Викторовна |
| | | | Ходанёнок Елена Фёдоровна |
| | | | Радкевич Наталья Вячеславовна |
| 8 | Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum-Mop 2 Lite MJSTL / BHR5217EU и денежные средства в размере 57,23 белорусского рубля | 5 | Исаченко Елена Евгеньевна |
| | | | Петруша Наталья Николаевна |
| | | | Шишко Людмила Федоровна |
| | | | Рукавичкина Лилия Евгеньевна |
| | | | Гринкевич-Гущина Марина Николаевна |
